ЦЭ, ЦТ
І МЭТАВАЯ
ПАДРЫХТОЎКА

ЧЫРВОНКА

ЯК СТАНОВЯЦЦА
ЧЭМПІЁНАМІ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЛЮТАГА 2023 г. ЧАЦВЕР № 26 (29906)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:

«На тэрыторыі краіны выяўлены сляды ўрану і золата, радовішчы жалезных руд і іншых карысных выкапняў. Аднак стрымальным фактарам для іх далейшага вывучэння з'яўляецца недастатковая эканамічная эфектыўнасць распрацоўкі з-за нізкай якасці сыравіны, якая саступае імпартнай, а таксама складаныя горна-геалагічныя ўмовы. Разам з тым Мінпрыроды пастаянна прапрацоўвае варыянты давывучэння і паляпшэння якасных характарыстык гэтых карысных выкапняў, а таксама шукае тэхналогіі іх абагачэння. Што датычыцца іншых разведаных запасаў карысных выкапняў, то іх аб'ёмы даюць магчымасць забяспечыць сыравінай усе буйныя горназдабыўныя прадпрыемствы Беларусі пры іх рабоце на поўную вытворчую магутнасць. Пры цяперашнім узроўні здабычы, прамысловымі запасамі калійнай і каменнай солі, даламіту, глін, пяску Беларусь забяспечаная больш як на сто гадоў. Запасаў торфу хопіць на 70 гадоў, а запасаў падземных водаў, будаўнічага каменю і трэпелу — больш як на 50 гадоў. Акрамя таго, дзякуючы пастаяннай рабоце геолагаў запасы карысных выкапняў у нас штогод папаўняюцца».

ПРАЦОЎНАЯ ЗМЕНА «НАФТАНА»



Фота БелТА.

Сёння флагман айчыннай нафтаперапрацоўкі ААТ «Нафтан» адзначае 60-гадовы юбілей. Менавіта 9 лютага 1963 года на новым прадпрыемстве ў Наваполацку быў атрыманы першы беларускі бензін. Але для супрацоўнікаў «Нафтана» сёння звычайны працоўны дзень, бо складаны тэхналагічны працэс перапыняць нельга. Аператары Дзмітрый КАБЫЛІНСКІ, Антон ГАРНАК і Уладзіслаў КАЙТАНАЎ (*на здымку*), як і іхнія шматлікія калегі, выйдуць на змену. З упэўненасцю, што робяць патрэбную людзям і краіне справу.

Зямля і людзі

ХВОЙНАЕ «ЖНІВО»

Самыя халодныя месяцы года — гарачая пара для работнікаў лясгасаў

Калі вы думаеце, што стройныя, высокія, чыстыя і светлыя лясы растуць самі па сабе, гэта вялікая памылка. Каб вясной і летам нам было дзе ўдыхнуць смалістага паветра, палюбавацца зіхаценнем сонечных прамянёў у пышных кронах і захапіцца харастом прыроды, круглы год працуюць тысячы работнікаў лясгасаў. Пара «іглічнага жніва» блізіцца да завяршэння якраз цяпер. Да надыходу вясны трэба падрыхтаваць да сяўбы маленькія семечкі, з якіх праз дзясяткі гадоў вырастуць зялёныя волаты — хвоі, елкі і лістоўніцы.

СТАР. 4

Па палічках

КВАТЭРА З ПРАБЛЕМАМІ, або На што звярнуць увагу пры куплі жылля

У мінулым годзе на рынку жылой нерухомасці Мінска былі пастаўлены рэкорды па колькасці продажаў кватэр. Але трэба памятаць, што купля любога жылля — працэс адказны, бо схема яго набыцця часам заблытаная. У гэтым выпадку трэба быць гатовым да пераадолення цяжкасцяў, каб пазбягаць непрыемнасцяў. Мы раскажам некалькі рэальных гісторый з прыкметамі праблемнай нерухомасці і параім, якія дзеянні неабходна распачаць, каб купля была бяспечнай.

СТАР. 15

КАРОТКА

- **Экспазіцыя Беларусі прадстаўлена на выстаўцы «Прадэкспа» ў Маскве.**
- «АМКАДОР» мае намер пашырыць супрацоўніцтва з Егіптам.

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 23026

Закон аб УНС падпісаны Прэзідэнтам

Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы

Мэтай дакумента з'яўляецца рэалізацыя канстытуцыйных нормаў аб Усебеларускім народным сходзе, замацаванне яго прававога статусу як вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя, а таксама вызначэнне парадку фарміравання і дзейнасці УНС.

Да дэлегатаў УНС аднесены кіраўнік дзяржавы, Прэзідэнт, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў, прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, мясцовых Саветаў дэпутатаў, а таксама грамадзянскай супольнасці.

Сход не мае права падмяняць іншыя дзяржаўныя органы, выконваць іх функцыі, умешвацца ў іх дзейнасць.

Кампетэнцыя УНС вызначана ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, у тым ліку прадугледжаны паўнамоцтвы на прыняцце рашэнняў:

• аб зацвярджэнні найбольш важных для краіны дакументаў (асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, ваеннай дактрыны, канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця);

• аб унясенні Прэзідэнту прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму;

• аб легітымнасці выбараў Прэзідэнта, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі;

• аб зняцці з пасады Прэзідэнта ў выпадку грубага парушэння ім Канстытуцыі або ўчынення цяжкага злачынства;

• аб выбранні суддзяў Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў, членаў ЦВК, вызваленні іх ад пасады;

• аб устанаўленні свят, святочных дзён і памятных дат;

• аб увядзенні надзвычайнага або ваеннага становішча;

• аб магчымасці накіравання ваеннаслужачых за межы краіны для ўдзелу ў дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі.

Маштабнасць паўнамоцтваў сходу прадугледжвае і асаблівы характар яго рашэнняў. Рашэнні УНС прымаюцца большасцю ад поўнага складу, з'яўляюцца абавязковымі для выканання і могуць адмяняць прававыя акты, іншыя рашэнні дзяржорганаў, якія супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі.

Для забеспячэння дзейнасці УНС плануецца стварыць Прэзідыум (пастаянна дзеючы калегіяльны орган для аператыўнага вырашэння пытанняў, што ўвахо-дзяць у кампетэнцыю УНС) і Сакратарыят (рабочы орган УНС). Колькасць Прэзідыума — 15 чалавек. Старшыня УНС, яго намеснікі, іншыя члены Прэзідыума выбіраюцца на першым пасяджэнні УНС са складу яго дэлегатаў.

Старшыня УНС і яго намеснікі ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, іншыя дэлегаты — без адрыву ад працоўнай дзейнасці.

Пасяджэнні УНС праводзяцца не радзей за адзін раз на год. Пасяджэнні Прэзідыума УНС — не радзей за адзін раз на 6 месяцаў.

Рэалізацыя закона надасць новы імпульс дзяржаўнаму развіццю. УНС, сфарміраваны на дэмакратычных пачатках, будзе выконваць стабілізуючую і кансалідуючую функцыі ў грамадстве.

У КАМІСІЮ МАЮЦЬ ПРАВА ЗВЯРНУЦЦА...

Падрабязнасці ўказа адносна жадаючых вярнуцца на радзіму

Апублікаваны склад камісіі па разглядзе зваротаў грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца за мяжой, па пытаннях учынення імі правапарушэнняў. Адпаведная камісія была ўтворана Указам № 25 ад 6 лютага бягучага года. Дакумент апублікаваны на інтэрнэт-партале Прэзідэнта Беларусі.

У склад камісіі ўключаны кіраўнікі дзяржаўных органаў, парламентарыі і прадстаўнікі грамадскіх структур. Старшынёй з'яўляецца генеральны пракурор Беларусі Андрэй ШВЕД. У яго на пасадзе кіраўніка камісіі два намеснікі. Гэта Валерый ГАЙДУКЕВІЧ і Аляксей СТУК, якія працуюць на пасадах намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы і намесніка генеральнага пракурора адпаведна.

У ліку астатніх членаў камісіі:

Рыгор АЗАРОНАК — палітычны аглядальнік дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне»;

Сяргей АЛЕЙНІК — міністр замежных спраў;

Дзмітрый БАСКАЎ — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці;

Уладзімір БАСЬКО — генеральны дырэктар навукова-тэхналагічнай асацыяцыі «Інфапарк»;

Алена БОГДАН — старшыня камітэта па ахове здароўя Мінскага гарвыканкама;

Аляксандр БАГДАНОВІЧ — старшыня асацыяцыі «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь»;

Юрый ВАСКРАСЕНСКІ — дырэктар інфармацыйна-аналітычнай установы «Круглы стол дэмакратычных сіл»;

Вадзім ГІГІН — старшыня праўлення рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды»;

Аляксандра ГАНЧАРОВА — старшыня Цэнтральнага савета грамадскага аб'яднання «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя»;

Дзмітрый ГАРА — старшыня Следчага камітэта;

Васіль ГУРСКІ — галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

Алег ДЗЯЧЭНКА — член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, рэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»;

Наталля КАРЧЭЎСКАЯ — рэктар установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

Іван КУБРАКОЎ — міністр унутраных спраў;

Анатоль ЛАПО — старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта;

Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу;

Аляксандр МАРКЕВІЧ — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па нацыянальнай бяспецы;

Марат МАРКАЎ — старшыня праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал»;

Ігар МАРШАЛАЎ — намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў;

Андрэй МУКАВОЗЧЫК — палітычны аглядальнік установы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Выдавецкі дом «Беларусь сегодня»;

Яўген ПУСТАВОЙ — палітычны аглядальнік дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне»;

Іван ТЭРТЭЛЬ — старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі;

Ганна ХАРУТА — намеснік старшыні рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі»;

Аляксей ШВАКАЎ — старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў;

Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ — старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын»;

Іван ЭЙСМАНТ — старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі.

У камісію маюць права звярнуцца жадаючыя вярнуцца на радзіму грамадзяне Беларусі, якія ўчынілі ў перыяд з 1 студзеня 2020 года да ўступлення ў сілу дадзенага ўказа адміністрацыйныя правапарушэнні або злачынствы пратэснай накіраванасці, апасаюцца вяртання ў краіну ў сувязі са сваім магчымым дачыненнем да ўчынення такіх правапарушэнняў, злачынстваў.

Адпаведныя звароты могуць быць накіраваны грамадзянамі ў тэрмін да 31 снежня 2023 года ў пісьмовай або электроннай форме з прыкладаннем неабходных дакументаў.

Пры гэтым названыя асобы павінны раскаяцца ва ўчыненым і праінфармаваць камісію аб гатоўнасці пасля вяртання публічна папрасіць прабачэння, кампенсаваць прычыненую шкоду, выконваць Канстытуцыю і заканадаўства Беларусі, паважаць дзяржаўныя сімвалы і нацыянальныя традыцыі, свядома і актыўна выконваць свой грамадзянскі абавязак.

Па выніках разгляду зваротаў грамадзяне будуць інфармавацца аб наяўнасці або адсутнасці ў дачыненні да іх адміністрацыйнага працэсу, распачатай крымінальнай справы, а таксама аб магчымасці іх спынення ў парадку і на ўмовах, устаноўленых заканадаўствам. Гэтыя рашэнні будуць прымацца камісіяй шляхам адкрытага галасавання большасцю галасоў і афармляцца пратаколамі.

Пасля таго грамадзяне абавязаныя прыбыць у краіну не пазней за тры месяцы з даты накіравання камісіяй адпаведнага паведамлення. Пры невыкананні гэтага патрабавання рашэнне камісіі страчвае сілу.

Адначасова ўказам прадугледжваецца гарантыя аб тым, што прыняцце любых працэсуальных рашэнняў адносна прыбылых грамадзян магчымае выключна са згоды генеральнага пракурора або асобы, якая выконвае яго абавязкі.

Указ змяшчае дакладны пералік таго, што павінны змяшчаць звароты. Яны павінны быць выкладзены на рускай або беларускай мове і змяшчаць найменне камісіі, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць) грамадзяніна, адрас яго месца жыхарства (месца знаходжання), дату апошняга выезду за межы Рэспублікі Беларусь, а таксама звесткі аб апошнім месцы работы (вучобы) у Рэспубліцы Беларусь.

У звароце таксама неабходна будзе выкласці інфармацыю аб прычынах, з якіх грамадзянін пакінуў тэрыторыю Беларусі; аб абставінах, у сувязі з якімі, як лічыць грамадзянін, яго могуць прыцягнуць да адміністрацыйнай і (або) крымінальнай адказнасці; аб жаданні вярнуцца ў Рэспубліку Беларусь і гатоўнасці пасля вяртання выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, законы і іншыя нарматыўныя прававыя акты, паважаць дзяржаўныя сімвалы і нацыянальныя традыцыі Рэспублікі Беларусь, свядома і актыўна выконваць свой грамадзянскі абавязак.

Пры ўчыненні правапарушэння грамадзянін таксама паведамляе аб чыстасардэчным раскаянні, гатоўнасці публічна папрасіць прабачэння і пакрыць прычынены ўрон (шкоду).

У выпадку з пісьмовымі зваротамі грамадзяніну неабходна будзе паставіць асабісты подпіс.

Да звароту павінны быць прыкладзены копія дакумента, што сведчыць асобу грамадзяніна, іншыя дакументы, якія, на думку грамадзяніна, маюць значэнне для разгляду такога пытання камісіяй, уключаючы асабістыя паручыцельствы. Паручыцелямі могуць быць дзеяздольныя паўналетнія асобы, грамадскія арганізацыі, палітычныя партыі, дзяржаўныя служачыя, працоўныя калектывы, іншыя аб'яднанні грамадзян, юрыдычныя асобы. Колькасць паручыцеляў не абмяжоўваецца.

Звароты разглядаюцца камісіяй па сутнасці ў тэрмін, не пазнейшы за два месяцы з дня іх паступлення. Пры неабходнасці старшыня камісіі мае права падоўжыць гэты тэрмін да трох месяцаў.

ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

Многае залежыць ад таго, як працуюць кіраўнікі на месцах

Такое меркаванне выказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА на падвядзенні вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і выканання бюджэту вобласці за 2022 год у Магілёве.

Ігар Сергеенка звярнуў увагу на некаторыя лічбы, якія прагучалі падчас абмеркавання вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Магілёўскай вобласці. «Важна, каб за лічбамі росту не хаваліся рэальныя праблемы, — падкрэсліў ён. — Напрыклад, мы гаворым аб знешнім гандлі: ёсць рост, у цэлым дадалі на 5,2 %. Аднак ён адбыўся з-за павелічэння цэн на прадукцыю, якая пастаўляецца, на 18,5 %. У натуральным выражэнні аб'ёмы знізіліся на 1-2 %. Што датычыцца дыверсіфікацыі рынку, то тут многае залежыць ад таго, як працуе сам кіраўнік. Напэўна, з улікам блізкасці Расіі ў Магілёўскай вобласці ў гэтым пытанні магчымасцяў больш, чым у іншых рэгіёнаў. Калі па сельскай гаспадарцы назіраецца тэмп росту, то па прамысловасці — падзенне. Заканамерна асеў і валавы рэгіянальны прадукт».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі нагадаў кіраўнікам райвыканкамаў аб базавым даручэнні кіраўніка дзяржавы па рэалізацыі ў кожным раёне аднаго-двух інвестыцыйных праектаў — стварэнні вытворчасці па выпуску прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю і новых рабочых месцаў. Уважліва трэба паглядзець на асваенне сродкаў мясцовых інавацыйных фондаў, што залежыць ад паваротлівасці і арганізаванасці кіраўнікоў на месцах, удзяліць увагу рэалізацыі Указа «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці». Усе гэтыя напрамкі работы пад кантролем.

У ліку іншых пытанняў, якія непасрэдна ўплываюць на сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта пазначыў дэфіцыт кадраў (перш за ўсё прамысловых спецыяльнасцяў) і прапанаваў зрабіць акцэнт на павышэнні ролі і значнасці рэзерву кіруючых кадраў. Ігар Сергеенка не пакінуў без увагі нізкі ўзровень сярэдняй заработнай платы, беспрацоўе, прафілактыку і барацьбу з карупцыяй, недапушчэнне крытычнага ўзроўню неабгрунтаванай знешняй працоўнай міграцыі, замацаванне маладых спецыялістаў на месцах.

Фота БелТА.

У Магілёўскай вобласці ў 2022 годзе выкананы пяць з васьмі асноўных паказчыкаў: намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата, якая склала па вобласці больш за Br1,3 тыс. (13,7 % да ўзроўню 2021-га), сукупнасць паступлення даходаў кансалідаванага бюджэту вобласці, аб'ём вытворчасці імпартазамяшчальных тавараў, зніжэнне ўзроўню затрат на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі, увод у эксплуатацыю жылых дамоў. Не выкананы паказчыкі па валавым рэгіянальным прадукце, інвестыцыях у асноўны капітал, уводзе ў эксплуатацыю жылых дамоў з дзяржаўнай падтрымкай.

Паводле БелТА.

Класныя навіны

«АБЕД — БОМБА! З'ЕЛА ЎСЁ»

Як ацэньваюць першыя вынікі пілотнага праекта навучэнцы і іх бацькі?

Харчаванне ў школах павінна быць не толькі здаровае, але і смачнае. У школьнікаў павінен быць выбар страў, і тады ніхто з іх не будзе адмаўляцца ад гарачага абеду. Гэта аксіёма, якую пацвярджаюць першыя вынікі пілотнага праекта, што стартаваў у краіне ў студзені і ахапіў 21 установу адукацыі: па тры — у кожнай вобласці і тры — у сталіцы. У рамках маніторынгу арганізацыі школьнага харчавання старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА наведала мінскую сярэднюю школу № 121, дзе вось ужо як месяц школьнікі харчуюцца па-новаму. Водгукі ад усіх (і вучняў, і іх бацькоў) толькі станоўчыя.

— Пілотны праект па арганізацыі харчавання школьнікаў мае сваю спецыфіку. Ён старанна прапрацоўваўся са спецыялістамі з НПЦ па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук, з Навукова-практычным цэнтрам гігіены і, што вельмі важна, з бацькоўскай грамадскасцю. Перш чым яго запусціць, праводзілася анкетаванне бацькоў, у якіх пыталіся, калі, на іх думку, лепш арганізаваць першы прыём ежы. Большасць выказалася за тое, каб карміць дзяцей пасля трэцяга ўрока. Іх меркаванне было ўлічана, — падкрэсліла Ірына Старавойтава. — Спецыялісты камбіната школьнага харчавання Мінска распрацавалі новае меню з магчымасцю выбару страў, смакавымі прыхільнасцямі і харчовымі звычкамі, якія сфарміраваліся ў дзяцей у сям'і. Сучасныя дзеці прызвычаіліся харчавацца разнастайна, да таго ж з'яўляюцца новыя прадукты і новыя рэцэптуры.

— Хачу заўважыць, што калі аналізавалі, якое меню хацелі б бачыць нашы дзеці, то школьнікі згадвалі і традыцыйныя беларускія дранікі, і варэнікі, і бліны, — дадала Ірына Старавойтава. — Усё гэта прысутнічае ў іх дамашнім рацыёне, таму яны хочуць так харчавацца і ў школе. Заўважу, што больш за мільён беларускіх школьнікаў, якія навучаюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, атрымліваюць гарачае харчаванне, таму гэта тэма заўсёды на асаблівым кантролі ў дзяржаўных органаў. Вельмі важна захаваць баланс — улічыць фізіялагічныя патрэбы дзіцяці ў пэўным узросце, смакавыя прыхільнасці дзяцей, пажаданні бацькоў, асаблівасці і магчымасці арганізацыі харчавання ў школах. Цяпер нам важна пачуць меркаванні ўсіх бакоў.

Харчаванне павінна быць здаровым, бяспечным і дыетычным, але і ігнараваць новыя тэндэнцыі ў харчаванні сучасных дзяцей няправільна.

— У нашай школе дзеці заўсёды елі добра. Ад гарачага харчавання адмаўляліся толькі адзінкі, — запэўнівае **дырэктар 121-й мінскай школы Жанна ДАВІДОВІЧ.** — Але цяпер і яны пачалі заходзіць у сталовую. Раней навучэнцаў кармілі пасля першага ўрока, але да гэтага часу яны не паспявалі прагаладацца, таму, на жаль, утвараліся адходы. Цяпер іх стала значна менш. Ад сняданкаў мы адмовіліся і перайшлі на абеды. Першы прыём ежы — пасля 3,5 гадзіны ад пачатку работы навучальнай установы. У 11.30 дзеці прыходзяць у сталовую ўжо з добрым апетытам. Прычым ёсць магчымасць выбару: заказаць абед з супам ці без яго. Большая частка выбірае абед з супам, калі, канешне, гэта не малочны (ён попытам, на жаль, не карыстаецца). А старшакласнікі і ўвогуле лічаць, што з супам абед атрымліваецца больш пажыўны. Узначальваюць рэйтынг першых страў баршчы, свежая капуста і расольнік. Нашы старшакласнікі змятаюць усё (смяецца. — **Аўт.**). Перад стартам пілотнага праекта ў школе прайшоў бацькоўскі сход, была дэгустацыя новых страў. І цяпер мы пастаянна маніторым меркаванні, у нас ёсць свой тэлеграм-канал, дзе вядзём «Дзённік эксперымента», размяшчаем фатаграфіі страў, ёсць чат-бот для аператыўнага рэагавання.

Як расказала Жанна Давідовіч, на «ўра» ў дзяцей ідуць новыя мясныя стравы, асабліва курыныя: філе, сцёгны, галёнкі.

«Абед — бомба! З'ела ўсё», — напісала дзяўчынка сваёй маці пасля чарговай навінкі ў меню. У той дзень на абед былі «Краш-догі» — гэта булачка з сялянскай каўбаскай, гароднінай і соусам, нешта накшталт любімага ўсімі дзецьмі хот-дога, толькі, дзякуючы метадам кулінарнай апрацоўкі, больш карысная страва. «А чаму не далі малодшай школе? Вельмі пазайздросцілі малышы...» — папракнуў хтосьці ў тэлеграм-канале школы.

На даны момант спаборнічаць па папулярнасці з краш-догамі могуць толькі пельмені. Уявіце: сапраўдныя дамашнія пельмені са смятанай!

Але ёсць і антырэйтынг: дзеці слаба ядуць малочныя прадукты, не вельмі «паважаюць» рыбныя стравы, зялёны кансерваваны гарошак.

У школе ёсць меню на два найбліжэйшыя тыдні, з ім кожны можна азнаёміцца. Дзеці замаўляюць сабе абед напярэдадні. Заяўкі збірае класны кіраўнік. А раніцай да 9 гадзін падаюцца ўдакладненыя спісы з улікам тых, хто захварэў, каб ежа не адпраўлялася ў адходы. Дзіця можа выбраць, якую ён хоча кашу: рассыпчатую ці вязкую? Катлету рубленую або біфштэкс? Калі дзіця выбірае абед без супу, значыць, суп кампенсуецца салатай. І першы, і другі варыянт абеду — абсалютна раўнацэнныя па энергетычнай каштоўнасці.

«Спаборнічаць па папулярнасці з краш-догамі могуць толькі пельмені. Уявіце: сапраўдныя дамашнія пельмені са смятанай!»

Чым гэты эксперымент спадабаўся дзецям? Тым, што да іх меркавання прыслухаліся! Нарэшце і чай сталі падаваць не салодкі. На сталах з'явіліся цукарніцы. І кожны можа цяпер падсаладзіць чай па сваім густе.

Заўважана, што для дзяцей мае значэнне ўсё: як афармлена памяшканне, дзе яны харчуюцца; сервіроўка сталоў і посуд, бо яны «ядуць вачыма». І такія нюансы для іх вельмі важныя. У школах, уключаных у праект, на сталах з'явіўся новы сталовы прыбор — нож, і, як высветлілася, нават малышы умеюць ім карыстацца.

Эксперымент па арганізацыі школьнага харчавання працягнецца да красавіка бягучага года. Ва ўстановах адукацыі будуць фіксаваць усе вынікі, адсочваць дынаміку, а таксама апытваць дзяцей і бацькоў. Да пачатку новага навучальнага года Міністэрства адукацыі і Савет Міністраў ацэняць вынікі пілотнага праекта і вырашаць, ці трэба гэты вопыт укараняць па ўсёй краіне. Мяркуецца, што ўдасца выпрацаваць аптымальную мадэль па арганізацыі школьнага харчавання.

Надзея НІКАЛАЕВА,
фота аўтара.

Па сутнасці

БУДУЧЫНЯ СВЕТУ

Час мульцяшнага скнары Скруджа — як сімвала неакаланіялізму, вяршэнства капіталу над чалавецтвам — праходзіць. Цяпер зноў час Чабурашкі. Касавыя зборы ў кінатэатрах паказваюць на тое. А яшчэ час добрага доктара Айбаліта, які лечыць ад хвароб і вірусаў. Ад геапалітычнай пандэміі — глабалізму. Менавіта ў Зімбабвэ каля ракі Лімпапо і лячыў звяроў гэты легендарны кніжны персанаж. Цяпер тут беларусы.

Самае простае і зразумелае — эканоміка. Кантакты і кантракты. Афрыка чакае інвестыцый. Не прыхватызацыі, а інвестыцый. Не «старлінкаў», а самых прыземленых тэхналогій. У земляробстве, адукацыі, фармацэўтыцы, будаўніцтве. Не спонсараў з тоўстым кашальком, а сяброў са спагадлівым позіркам. Беларусь і Зімбабвэ глядзяць у адзін бок. Бок далейшага развіцця. Бо Мінск «корміць» не назойліваі іншазямнай дэмакратыяй, а дапамог кіраўніку Зімбабвэ літаральна накарміць 15-мільённы народ. І гаворка не пра «гуманітарку», а пра тэхналогіі. «Беларусы» і «БелАЗы» мы экспартуем разам з кампетэнцыямі. Сэрвісна-навучальны цэнтр — як прадстаўніцтва краіны з магутнай назвай «Бізон» — добрую сцежку вытаптаў для нашай прадукцыі ў Зімбабвэ. Дарэчы, бізон — амерыканізаваная версія нашага роднага зубра. Прызвычаяцца хуткага і да зубра. Як да нашай тэхнікі. Быць камбайнерам альбо трактарыстам — модна. Бо ежа — гэта вельмі важна. А беларуская тэхніка вельмі зручная. Гарманічна сярод саванны выглядаюць не толькі нашы трактары. Мясцовым прыгажуням, дарэчы, пасуюць беларускія нацыянальныя строі, у якіх яны на адным з мерапрыемстваў сустракалі нашага Прэзідэнта.

Вядома, культурная экспансія англасаксаў адчуваецца паўсюль. Зімбабвэ адна з апошніх на Афрыканскім кантыненце скінула кайданы апартэіду. Цывілізаваны заходні «гуманіст» не даравaў страчаную ўрадлівую глебу і алмазныя нетры — краіна дагэтуль пад заходнімі санкцыямі. Таму неаранае поле працы. Беларусы яго засяваюць. У літаральным і пераносным сэнсе. Зноў кантракты на тысячы адзінак тэхнікі: для земляробства — трактары і камбайны, для руднікоў — «БелАЗы». Сярод новага — лесанарыхтоўчая тэхніка, пажарныя машыны, будаўнічыя тэхналогіі. Дамоўленасці ў сферы адукацыі. Бо вядома: атрымаўшы ў нас адукацыю, іх спецыялісты будуць імкнуцца і далей працаваць з намі. Адукацыя — інвестыцыі ў будучыню — прыхільнасць да нашых тавараў і кампетэнцый. А яшчэ мы будзем для Зімбабвэ насамрэч «айбалітамі». Фармацэўтыка — яшчэ адзін кірунак супрацоўніцтва.

За трыццаць гадоў дыпламатычных адносін было заключана каля дзесяці кантрактаў, пагадненняў, мемарандумаў. Столькі ж — за трыццаць хвілін у прысутнасці кіраўніка нашай дзяржавы. Вядома, да яго візіту рыхтаваліся. Бо ведаюць, любяць, паважаюць. У першую чаргу за палітычную пазіцыю. Роўны — з роўнымі. За тое, каб быць роўнымі: і без таго барвовую глебу паілі крывёй вызваленчай барацьбы. Цяперашні кіраўнік Зімбабвэ быў актыўным удзельнікам барацьбы за незалежнасць. Цяпер вышэй за заходнія атэлі — «Акр нацыянальных герояў». На гэтую вяршыню рэдка каго прыводзяць. Аляксандра Лукашэнку запрасілі.

Кракадзіл выцесніў з басейна вадаспада Вікторыя і буйвалаў, і бізонаў, і амерыканскіх ястрабаў. Але анаконда працягвае поўзаць па джунглях Афрыкі. Гаворым «Кракадзіл» — маем на ўвазе і Эмерсана Мнангагву. Гэта яго рэвалюцыйны псеўданім падчас барацьбы з апартэідам. «Буйвалы, бізоны, ястрабы» — татэмныя сімвалы — англасаксаў і НАТА. А «анаконда» — кодавая назва праекта заходніх краін па ўдушэнні непажаданых дзяржаў. Як вам такі «звярынец»?

У вачах мясцовых жыхароў адлюстроўваецца памяць каланіяльнай залежнасці. Але сёння рэгіён глядзіць з надзеяй на будучыню і на белага чалавека, які ідзе з дабром. Калі атрымаецца ў Зімбабвэ, то далучацца і іншыя. Спрацуе «сарафаннае радыё». Падчас беларускага турнэ тут гаворка ішла і пра Мадагаскар.

Што ж датычыцца вынікаў дзяржаўнага візіту ў Зімбабвэ, то па розных падліках ён ацэньваецца ў 200—250 мільёнаў долараў. Але галоўныя вынікі яшчэ ў перспектыве — запасы літыю. Сыравіны для акумулятараў — сэрца электратранспарту. А яшчэ Зімбабвэ можа ператварыцца ў хаб беларускіх інтарэсаў на поўдні Афрыкі. Пакуль тут адзін пасол і невялікі штат дыпмісіі на пяць краін, што па тэрыторыі ажно як увесь ЕС. Але ўжо вялікія далягляды.

Паўтарамільярдная Афрыка — насамрэч будучыня свету. Доля моладзі ў 2050 годзе на кантыненце дасягне каля 60 працэнтаў. Гэта адзіны рэгіён свету, у якім будзе назірацца значны прырост насельніцтва да канца стагоддзя. Спалучэнне чалавечых рэсурсаў і багацця нетраў. Алмаз, які патрабуе агранкі.

Нашы кампетэнцыі якраз даспадобы і аднаму з самых заможных рэгіёнаў Блізкага Усходу. Пяць мільярдаў долараў арабскія шэйхі гатовыя інвеставаць у нашу эканоміку. Пра што гэта сведчыць? Пра тое, што нам давяраюць. Тэхналогіям і магчымасцям, грамадска-палітычнаму ладу. Пяць мільярдаў долараў інвестыцый — найлепшае пацвярджэнне легітымнасці ўлады. А яшчэ такія сур'ёзныя ўкладанні — страхоўка ад знешняга ўздзеяння на нашу краіну. Арабскаму свету тое не будзе падабацца. А арабскі свет — адзін з цэнтраў сусветнай сілы.

Караван ідзе, а сабака брэша. Гэтыя візіты намагаліся запэцкаць апаненты ўлады. Нават абураліся: чаму з сынамі кіраўнік дзяржавы быў на перагаворах. Сямейнасць у арабаў — залог даверу. Што-што, а давер усё больш краін свету выказвае нашаму Прэзідэнту. Гэтыя візіты маюць не толькі эканамічныя ды палітычныя вынікі. Гэта яшчэ і пасыл свету. Шматполюснаму свету. Дзе сябруюць краінамі, але не дыктуюць умовы.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ХВОЙНАЕ «ЖНІВО»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Заўважым, што не раслі лясы зручнымі для чалавека і раней, калі яны яшчэ не былі «перакрэсленыя» аўтамагістралямі і разарваныя гарадамі. Наўрад ці, трапіўшы ў сапраўды «аўтэнтычны» лес, сучасны чалавек прыйшоў бы ў захапленне: непраходны падлесак, паваленыя ветрам дрэвы і іншыя з'явы прыроды наўрад ці зрабілі б шпацыр прыемным. У сучасным свеце уся так званая дзікая прырода прыручаная — патрабуе няспыннай увагі і пастаяннай удумлівай працы.

— Сёння на дзяржаўным узроўні пастаўлена задача па стварэнні лясоў з палепшанымі спадчыннымі ўласцівасцямі — іх павінна быць не менш за палову агульнай плошчы, — распавядае **намеснік кіраўніка Старадарожскага доследнага лясгаса Уладзімір БІЧАН.** — А для такіх лясоў патрэбна элітнае насенне. З нашай пастаяннай лесанасеннай плантацыі плошчай 17,8 га шышкі з надыходам адпаведнага сезона мы збіраем у першую чаргу.

РУЧНЫ ЗБОР ШЫШАК

У сезон шышкі збіраюць не толькі на спецыяльнай плантацыі лясгаса, але і ў лесе — праўда, не любыя.

— Згодна са стандартам, сасновая шышка павінна быць не менш як 1,6 см у дыяметры, — тлумачыць **інжынер па лесааднаўленні і меліярацыі Старадарожскага лясгаса Валянціна КАМКАР.** — Яна павінна быць непашкоджаная, роўная і моцная.

Збор пасяўнога матэрыялу іглічных парод штогод распачынаецца ў канцы снежня. Цяпер «хвойнае жніво» ўжо завяршаецца. На збор шышак кінуты ўсе сілы: каля 200 чалавек займаюцца гэтым штодня. Дзённая норма на чалавека — каля 20 кілаграмаў. Праца нялёгкая, патрабуе ўвагі і фізічных сіл: як цалкам механізаваць яе, пакуль ніхто яшчэ не прыдумаў.

— Шышкі збіраюць уручную, — расказвае Валянціна Мікалаеўна. — Яшчэ ў лістападзе на плантацыі мы фарміруем крону так, каб сасонкі былі ніжэйшыя і прасцей было збіраць ураджай.

Дрэвы пачынаюць пладаносіць у шасці-сямігадовым узросце, калі яны яшчэ невысокія.

— Па плане на 2023 год мы павінны сабраць 16 тон шышак сасны. На сённяшні дзень ужо сабрана 26 тон (у тым ліку 5,9 тоны элітнага насення). Акрамя таго, мы сабралі каля 400 кг шышак елкі і больш за 120 кг — лістоўніцы.

Лішкі не прападуць. Па-першае, кожны лясгас павінен мець трохгадовы запас пасяўнога матэрыялу іглічных, тлумачыць Валянціна Камкар. А па-другое, старадарожскія сасонкі славяцца сваёй устойлівасцю і жыццяздольнасцю і карыстаюцца попытам у многіх лясгасаў нашай краіны і суседняй Расіі.

— Ужо сёлета мы заключылі дагавор з Акцябрскім лясгасам на мільён дзвесце сеянцаў сасны, з Буда-Кашалёўскім — на 500 тысяч. Ёсць кантракты і з расійскімі лясгасамі, — кажа яна.

На плантацыі, распавяла Валянціна Камкар, пасеў закладваецца з разліку 55 кг насення на гектар, а на лесакультурных плошчах на гектар неабходна 6600 сеянцаў.

— Таму, хоць нарыхтоўваюць шышкі і вырошчваюць сеянцы іглічных практычна ўсе лясгасы, многім не хапае. Штогод мы прадаём па 5-6 мільёнаў сеянцаў сасны.

На якасць насеннага матэрыялу ўплываюць не толькі ідэальныя ўмовы вырошчвання дрэў (якія забяспечвае плантацыя). І не толькі якасць шышак, сабраных у лесе. Тут важна літаральна ўсё: своечасовы збор, сучасная перапрацоўка і аптымальныя ўмовы захоўвання.

— У нас усходжасць насення хвоі палепшаных сартоў (гэта значыць з шышак, сабраных у гадавальніку) складае 95-96 %. З шышак, сабраных у лесе, усходжасць насення — каля 90 %, — кажа суразмоўніца.

Яна адзначае, што насенне да сяўбы праходзіць строгі кантроль: кожны год узор атрыманага насеннага матэрыялу лясгас адпраўляе на даследаванне ў Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр. Там даюць заключэнне па ўсходжасці і іншых параметрах і прысвойваюць насенню клас.

ШЛЯХ СЕМАЧКІ

Сабраныя і на плантацыі, і ў лесе шышкі ў вялікіх мяшках прыязджаюць у шышкасушылку — вытворчае памяшканне, дзе з іх атрымліваюць насенне.

— Шышкі мы загружаем у барабаны сушыльнай камеры: адна загрузка складае 400 кілаграмаў. З іх мы атрымаем каля 4 кг насення. Поўны цыкл да атрымання насення займае двое сутак, — кажа **лесавод Вікторыя ЛАШМАНОВА.**

Сушацца шышкі пры 55 градусах. У выніку шышка расчыняецца і адтуль вылятае так званая крылатка. У прыродзе насенне іглічных забяспечанае «крылцамі», каб яны падалі далей ад мацярынскага дрэва і ў далейшым саджанцам хапала пажыўных рэчываў ды сонечнага святла. Але «крылцы» пагаршаюць усходжасць насення, ускладняюць захоўванне і сяўбу, растлумачылі ў лясгасе. Таму наступны этап — абяскрыльванне. «Пушыстую» масу ўвільгатняюць вадой з невялікім працэнтам марганцоўкі (каб выключыць шкоднікаў і хваробы) і змяшчаюць у спецыяльны агрэгат — «абяскрыльвальнік», які вонкава нагадвае пральную машыну. Далей па тэхналогіі — перасоўванне насення для абвейвання, і цяжкае семечка падае ў падстаўленую кювету. Цяпер застаецца толькі прасеяць насенне праз сіта, на працягу дзвюх гадзін прасушыць у сушылцы і змясціць у шкляную бутлю на захоўванне, у прахалоднае сухое месца. У такіх бутлях, падобных на колбы алхімікаў, насенне можа захоўвацца да трох гадоў — яго жыццёвая сіла будзе спаць, пакуль яе не абудзяць сонейка і вясновая зямля.

Але наогул сеяць хвойкі ў Старых Дарогах імкнуцца хутчэй, свежым насеннем: ужо ў красавіку сабраныя цяпер семечкі ўпадуць у разоры. Праз год-два, зусім маленечкімі (памерам з сярэдняй вышыні пакаёвую кветку), іх адправяць «на ПМЖ» у старадарожскія лясы. А можа быць, іх чакае і больш далёкае падарожжа — у іншыя рэгіёны нашай краіны або нават за яе межы.

— Добра прыжываюцца аднагадовыя хвойкі, — тлумачыць Валянціна Камкар. — Двухгадовыя — скідваюць ігліцу аж да верхавіннай пупышкі, але зноў абрастаюць наступнай вясной. А вось трохгадовыя саджанцы сасны на новым месцы прыжываюцца не надта ахвотна, могуць падсыхаць. Хвоя — культура досыць далікатная і капрызная. Вось саджанцы елкі можна і ў тры, і ў чатыры, і ў пяць гадоў пасадзіць, а сасна — два гады, і ўсё.

Велізарнымі і магутнымі дрэвамі хвоі становяцца праз 70-80 гадоў. Пасля васьмідзесяці яны лічацца спелым лесам, які можна секчы. Тэрмін жыцця гэтых дрэў — больш за стагоддзе.

ЕЛКА СТАНЕ РЭДКАСЦЮ?

Дарэчы, елкі, пры ўсёй іх, здавалася б, непераборлівасці і распаўсюджанасці, цалкам магчыма, хутка стануць у нашых шыротах дрэвам рэдкім.

— У сувязі з кліматычнымі зменамі арэал распаўсюджвання елкі паступова ссоўваецца на поўнач і сыходзіць з Беларусі, — распавялі ў Старадарожскім доследным лясгасе.

Зрэшты, не было б тое, было б што другое, і на змену змрочным яловым лясам прыходзяць светлыя ліставыя (клён і алешына, дубовыя і бярозавыя гаі), а з іглічных парод — лістоўніца і сасна (у вырошчванні якой калектыў Старадарожскага лясгаса — профі). Нягледзячы на высокі попыт, у першую чаргу сеянцы хвоі пойдуць не на рэалізацыю, а на ўласныя патрэбы — на папаўненне зялёных насаджэнняў на тэрыторыі, за якую адказвае Старадарожскі лясгас (а гэта 70,5 тыс. га, 61,4 тыс. з якіх пакрыта лесам).

— Увосень мы робім інвентарызацыю лясных культур, улічваем, якая ў нас прыжывальнасць саджанцаў, і падлічваем, колькі трэба пасадачнага матэрыялу, — тлумачыць інжынер па лесааднаўленні і меліярацыі. — Сёлета вясной нам спатрэбіцца паўтара мільёна штук сеянцаў на дапаўненне лясных культур. У нас па Старадарожскім лясгасе вялікія аб'ёмы стварэння пасяўных аддзяленняў, таму мы нарыхтоўваем шмат шышак. А ў цэлым за апошнія пяць гадоў у нас створана каля 750 га лясных культур.

Прычынай неабходнасці аднаўляць лес кожны год становяцца бураломы (летась іх было нямала), акрамя таго, сеянцы садзяць на месцы плошчаў, якія высякаюцца.

— Паводле нарматываў, на месцы спелага лесу, які быў высечаны, малады лес трэба пасадзіць на працягу двух гадоў, — кажа Уладзімір Бічан. — Але мы стараемся зрабіць тое адразу ж, каб не даць магчымасці вырасці непажаданаму маладняку (гэта маліннік, ажыннік, асіннік), які можа заглушыць дрэўцы.

Падлесак расце хутка, а хвоя — павольна. Так што вырошчванне соснаў — праца на далёкую перспектыву, для будучых пакаленняў. Але калі акружыць маладыя хвойкі клопатам і ўвагай сёння, прыйдзе дзень, калі яны паднімуцца ўверх і зашумяць зялёнымі кронамі ў сінім небе, цешачы вока і дорачы людзям здароўе, чыстае паветра і водар ігліцы.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Парламент Паўднёвай Карэі аб'явіў імпічмент кіраўніку МУС

Нацыянальны сход Паўднёвай Карэі вынес імпічмент міністру ўнутраных спраў і бяспекі Лі Сан Міну з-за недастаткова эфектыўных, на думку парламентарыяў, дзеянняў улад падчас цісканіны ў Сеуле, якая забрала жыцці амаль 160 чалавек. Аб гэтым паведаміла агенцтва Yonhap. Як падкрэслівае агенцтва, галасаванне стала гістарычным, паколькі ўпершыню парламент краіны аб'явіў імпічмент члену ўрада. Пры гэтым сам вынік галасавання не з'яўляецца нечаканым, бо яго ініцыявала апазіцыйная Дэмакратычная партыя «Табура», якая кантралюе большасць у заканадаўчым органе — 169 з 300 месцаў. Імпічмент падтрымалі 179 парламентарыяў супраць 109. Цяпер канстытуцыйны суд рэспублікі павінен на працягу 180 дзён выказаць сваё меркаванне: падтрымаць імпічмент альбо аднавіць Лі Сан Міна на пасадзе міністра. Да гэтага моманту палітык часова адхілены ад пасады. Рашэнне парламента пракаментавалі ў офісе прэзідэнта Юн Сок Ёля. «Гэта адыход ад традыцый парламентарызму. Гэта ўвойдзе ў гісторыю парламента як момант ганьбы», — адзначаецца ў заяве офіса.

Французскія фермеры ў рамках акцыі пратэсту вывелі сотні трактароў на вуліцы Парыжа

Французскія фермеры выехалі на трактарах на вуліцы Парыжа ў знак пратэсту супраць абмежаванняў на выкарыстанне інсектыцыдаў у краіне і ўвядзення іншых экалагічных норм. Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters. «Неаднаразовыя забароны і бяздзейнасць французскага ўрада ў дачыненні да многіх сектараў шкодзяць сельскагаспадарчай вытворчасці», — адзначаецца ў сумеснай заяве прафсаюза фермераў FNSEA, прафсаюза цукровых буракоў CGB і групы маладых фермераў JA. На некаторых трактарах былі плакаты з надпісамі «Макрон ліквідуе сельскую гаспадарку» і «Выратуйце вашага фермера». Раней рашэннем суда ЕС была адменена французская палітыка, якая дазваляе вытворцам цукровых буракоў у краіне выкарыстоўваць інсектыцыд, які атрымаў у Еўрасаюзе назву «забойца пчол». Гэта выклікала занепакоенасць у мясцовых аграрыяў, якія лічаць, што мера прывядзе да далейшых скарачэнняў пасеваў цукровых буракоў і закрыцця цукровых заводаў.

Узрослая колькасць ледавіковых азёраў уяўляе пагрозу для 15 мільёнаў чалавек

Каля 15 мільёнаў чалавек па ўсёй планеце жывуць у рэгіёнах, якія могуць быць закрануты паводкамі, выкліканымі раставаннем ледавікоў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на прэс-службу новазеландскага Універсітэта Кентэрберы. Па словах супрацоўніка ўніверсітэта і аднаго з аўтараў даследавання Томаса Робертсана, змена клімату выклікае паступовае раставанне ледавікоў і ўтварэнне ледавіковых азёр. Па меры росту іх аб'ёму і эрозіі глебы павялічваецца пагроза так званага прарыву ледавіковага возера — скідвання вады ў выніку разбурэння натуральных бар'ераў, якое можа адбывацца раптоўна і прыводзіць да сур'ёзных разбурэнняў. Каля паловы ўразлівых груп насельніцтва прыпадае на Індыю, Пакістан, Кітай і Перу. Пры гэтым, калі найбольш сур'ёзны ўзровень пагрозы паводак выяўлены ў першых трох краінах, то амерыканскія Анды, на думку навукоўцаў, выклікаюць большую турботу, паколькі яны менш вывучаныя. Акрамя таго, калі ў Гімалаях і іншых горных сістэмах Азіі колькасць ледавіковых азёраў з 1990 года ўзрасла на 37 %, то ў Андах яна павялічылася на 93 %.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 ЛЮТАГА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15947)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Вольга РАЦЭВІЧ:

«Эксперыменты дапамагаюць набыць літаратурную вопытнасць»

«Чырвонка. Чырвоная змена» сустрэлася з галоўным рэдактарам літаратурнага часопіса «Маладосць», выданнем, старонкі якога сталі стартавай пляцоўкай для юных паэтаў і празаікаў. Мы паразмаўлялі з Вольгай Рацэвіч аб літаратурных аб'яднаннях, вядомым конкурсе «БрамаМар», а таксама даведаліся, што трэба зрабіць, каб убачыць свой твор на старонках часопіса.

— Вольга Станіславаўна, вы, як галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», маеце непасрэднае дачыненне да творчасці маладых аўтараў. Распавядзіце, калі ласка, у чым адметнасць твораў сучасных аўтараў, якія толькі пачалі свой творчы шлях?

— Гэта рух у розных кірунках, і ён абсалютна натуральны, заканамерны. Маладым ва ўсе часы былі ўласцівыя пошук новых тэм і формаў, зварот да нераспаўсюджаных жанраў. Калі гаварыць пра паэзію, то адны аўтары ўсё больш адыходзяць ад класікі і выбіраюць свабодную форму верша; другія пішуць у так званай тэхніцы патоку свядомасці: без выкарыстання вялікіх літар і знакаў прыпынку. Трэція, наадварот (і адбываецца гэта значна радзей), звяртаюцца да цвёрдых формаў верша: санета, трыялета, лімерыка, запазычанага ў японцаў хайку.

Маладыя празаікі аддаюць перавагу апавяданню, радзей — аповесці. І ўжо зусім цяжка знайсці ў іх раман. Набірае моц жанр нон-фікшн. А як вынік самакапання і самааналізу ўсё часцей узнікаюць рэфлексіі, імпрэсіі, мініяцюры, эсэ, заснаваныя на ўражанні ад той ці іншай з'явы, з уласцівымі ім лірызмам і псіхалагізмам.

— Наколькі маладыя аўтары, якія звяртаюцца ў часопіс, прагнуць эксперыментаў у літаратуры?

— Не так даўно ў рэдакцыю «Маладосці» даслала вершы студэнтка другога курса БДУ Яўгенія Касіловіч. Што здзівіла: яны напісаныя гекзаметрам — амаль забытым антычным метрам. Цікавы і даволі складаны выбар 20-гадовай дзяўчыны.

У лістападаўскім нумары ўпершыню ў «Маладосці» былі апублікаваныя творы пачынаючага паэта Алеся Гомана. У яго лірычных, часта сумных, нават у нечым фатальных вершах адчуваецца перайманне творчага стылю класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Здаецца, нейкае падабенства ёсць нават у знешнасці. Вось такі ўзор для творчасці абраў юнак.

Здзіўляюць і тэмы. Напрыклад, апавяданне Андрэя Дзічэнкі «Чатыры кілаграмы бактэрый», у якім ён апісаў адзін дзень з жыцця патолагаанатама, адкуль мы і даведваемся, якая менавіта колькасць бактэрый месціцца ў чалавечым арганізме. Альбо назіранні за сабой паўмёртвым у аповедзе Івана Мелава «Апошні дзень». Пачуваешся ніякавата, калі чытаеш.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

З нагоды

ЗАСТАЮЧЫСЯ ВЕРНЫМІ ДЭВІЗУ

Штогод у пачатку лютага адзначаецца Дзень маладзёжных атрадаў аховы правапарадку

Дэвіз «Мужнасць. Адказнасць. Айчына. Патрыятызм» аб'ядноўвае ў маладзёжных атрадах аховы правапарадку тысячы хлопцаў і дзяўчат па ўсёй краіне. У любое надвор'е яны дапамагаюць супрацоўнікам праваахоўных органаў і ратавальнікам забяспечваць спакой і парадак на вуліцах беларускіх гарадоў і вёсак, займаюцца прафілактычнай работай бяспекі жыццядзейнасці. Маладзёжны праваахоўны рух БРСМ з'яўляецца складнікам грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі.

Фота БРСМ.

Пачынаючы з 2003 года БРСМ арганізаваў работу аператыўных маладзёжных атрадаў дружыннікаў (АМАД). Перад грамадскім інстытутам стаяла задача стварыць дзейсныя механізмы вырашэння маладзёжных праблем, у тым ліку па зніжэнні злачыннасці, шкодных звычак, распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі.

З верасня 2005 года дзейнасць ужо МААП каардынуе Рэспубліканскі штаб маладзёжных атрадаў аховы правапарадку: завершана фарміраванне і афармленне рэспубліканскай структуры МААП, адпрацавана ўзаемадзеянне з органамі ўнутраных спраў на месцах. Работа атрадаў сістэматызавана і накіравана на падтрыманне парадку падчас правядзення розных масавых мерапрыемстваў, папярэджанне і спыненне правапарушэнняў, індывідуальную работу з падлеткамі, якія стаяць на ўліку ў інспекцыях па справах непаўналетніх, прафілактычную работу па выкараненні алкагалізму, наркаманіі ў маладзёжным асяроддзі. Аднак статус «рух» маладзёжныя атрады аховы правапарадку атрымалі толькі ў 2010 годзе і ўжо з 2011 года развіваюцца як самастойны кірунак.

З мэтай захавання традыцый маладзёжнага праваахоўнага руху заснаваны нагрудныя знакі «Воінская доблесць» (2007 год) і «За адзнаку ў ахове правапарадку» (2008 год).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прыёмная кампанія — 2023

ЦЭ, ЦТ І МЭТАВАЯ ПАДРЫХТОЎКА

Што трэба мець на ўвазе абітурыентам бягучага года

28 студзеня ў Беларусі прайшоў рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен, удзел у якім узялі больш як 52 тысячы адзінаццацікласнікаў. Пад «рэпетыцыю» было задзейнічана 2600 аўдыторый у 144 пунктах правядзення ЦЭ. З боку педагагічнай грамадскасці да гэтай працэдуры былі прыцягнутыя каля 8 тысяч чалавек. Пераважна тыя педагогі, якія будуць працаваць і на самім ЦЭ. Для гэтага «рэпетыцыя» і была задумана, каб людзі атрымалі вопыт, а таксама каб ліквідаваць «вузкія месцы» ў арганізацыі экзамену.

Фота БелТА.

ДАСТАЎКА НА ЭКЗАМЕН — АБАВЯЗАК ШКОЛЫ

У Міністэрстве адукацыі працаваў штаб для каардынацыі правядзення рэпетыцыйнага этапа цэнтралізаванага экзамену, які вёў аператыўны маніторынг сітуацыі на кожным пункце правядзення ЦЭ. Па інфармацыі галоўнага адукацыйнага ведамства, усё прайшло ў штатным рэжыме. Дзе-нідзе на ўваходзе ў пункты правядзення ЦЭ ўтвараліся чэргі, і гэта тая акалічнасць, над якой яшчэ трэба будзе папрацаваць.

Напрыклад, на базе БДУ рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен праходзілі каля дзвюх тысяч адзінаццацікласнікаў. Пад выпрабаванне па дзесяці прадметах былі задзейнічана больш як 50 аўдыторый у пяці карпусах універсітэта. «Гэта сур'ёзная нагрузка на нашу інфраструктуру, — канстатаваў **старшыня арганізацыйнай камісіі па правядзенні цэнтралізаванага экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання ў БДУ, прарэктар універсітэта Канстанцін КАЗАДАЕЎ.** — Невялікія чэргі на ўваходах абумоўлены цэнтралізаваным падвозам школьнікаў. Іх прывозяць адразу вялікімі групамі, а групы прапускаюцца ўжо ў парадку чарговасці...»

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

9 02 2023 г.

ЦЭ, ЦТ І МЭТАВАЯ ПАДРЫХТОЎКА

Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Паводле інструкцыі, дастаўляць вучняў на ЦЭ павінна ўстанова адукацыі. І гэта не залежыць ад таго, патрабуецца падвоз з сельскага пункта ў райцэнтр ці размова ідзе аб перамяшчэнні ў самім раённым цэнтры, абласным горадзе або ў Мінску. У Міністэрстве адукацыі тлумачаць: ЦТ — гэта асабістая справа абітурыента і яго бацькоў, якія хвалююцца, ці даехала іх дзіця да пункта здачы ЦТ, і тут школа адказнасці не нясе. А вось у дачыненні да цэнтралізаванага экзамену дастаўка, рэгістрацыя і суправаджэнне — абавязак школы, бо размова ідзе пра атрыманне атэстата.

Педагогі ўжо выказваюць свае пажаданні. Сярод прапаноў — змяніць час прыбыцця ў першасны пункт збору навучэнцаў. Не трэба збіраць дзяцей у школах у 8 раніцы, калі пачатак тэсціравання ў 11.00. Да таго ж адзінаццацікласнікі не толькі прыязджалі са сваімі суправаджаючымі педагогамі, але і пакідалі з імі ж пункт здачы іспыту. У буйных гарадах, магчыма, пасля ЦЭ дазволяць школьнікам дабірацца дадому самастойна, папярэдне атрымаўшы на гэта згоду бацькоў. Напрыклад, дзецям, якія хутка справіліся з заданнем, было нязручна працяглы час чакаць іншых.

У правядзенні новага іспыту, дарэчы, ёсць асаблівасці: рэгістрацыяй удзельнікаў займаецца пункт правядзення ЦЭ сумесна з камісіямі школ. Яшчэ адзін адметны момант — усе раёны і школы замацаваны за канкрэтнымі пунктамі, таму ў школьніка няма магчымасці выбраць самастойна іншы пункт, больш зручны для яго, як гэта адбываецца на ЦТ.

Напярэдадні рэпетыцыі члены аргкамісій прайшлі навучанне, для кожнага правялі інструктаж. У пэўны дзень сумесна з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў пункты ЦЭ даставілі экзаменацыйныя матэрыялы. Яны цалкам ідэнтычныя тым, што будуць прапанаваныя выпускнікам у маі.

Рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен праходзіць па адпрацаванай за многія гады тэхналогіі цэнтралізаванага тэсціравання ў тэставай форме. Тэсты сфарміраваныя на аснове заданняў базавага ўзроўню асваення праграм па вучэбных прадметах. У іх не выкарыстоўваюцца заданні павышанага пятага ўзроўню складанасці. Затое павялічылася колькасць заданняў вобласці «В» (да 20—22), дзе не прапануюцца дыстрактары (варыянты заданняў).

Тэхналогія праверкі тая ж, што і пры ЦТ, — абязлічаная, камп'ютарная. Гэта складаны, працяглы, але ў той жа час адладжаны працэс. Бланкі скануюцца, алічбоўваюцца. На гэтым этапе камп'ютар можа нешта не распазнаць, таму ў інтарэсах таго, хто здае экзамен, праводзіцца верыфікацыя. Праблема ў тым, што сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтную якасць пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат. А верыфікатары дапамагаюць машыне разабраць «каракулі» ў бланку, выдаляюць і ўвесь бруд: напрыклад, абітурыент выпадкова чыркнуў ручкай, і, каб камп'ютар не залічыў яму няправільны адказ, гэта з элетроннай выявы прыбіраецца. Электронная выява раздзяляецца на частку рэгістрацыі і частку адказаў. Адны аператары правяраюць толькі рэгістрацыю, а другія — толькі адказы і нават не ведаюць, чыя работа знаходзіцца перад імі на экране. Верыфікатар не бачыць бланк адказаў цалкам. За кожную вобласць адказваюць розныя людзі. Уся працэдура праверкі бланкаў строга канфідэнцыйная.

ШКОЛЬНАЯ АДЗНАКА І ТЭСТАВЫЯ БАЛЫ

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў (РІКВ) абяцаюць праверыць усе тэставыя работы за два-тры тыдні. Вынікі загрузяць на сайт інстытута, і навучэнцы ў раздзеле «Вынікі ЦЭ» змогуць атрымаць іх па пашпартных даных.

Нядаўна былі зацверджаны шкалы пераводу тэставых балаў у школьную адзнаку. Для таго каб атрымаць «дзясятку» па рускай і беларускай мове, трэба набраць ад 82 да 100 балаў, па матэматыцы — ад 77 балаў да 100, па фізіцы — ад 79 да 100 балаў, хіміі — ад 85 да 100 і гэтак далей. Як відаць, інтэрвал тэставых балаў, якія гарантуюць максімальны школьны бал, даволі істотны. Між іншым, пры падачы сертыфікатаў ЦЭ ў прыёмную камісію кожны бал будзе для абітурыентаў на «вагу золата»... Дапусцім, два выпускнікі нясуць дакументы ў БДУ на спецыяльнасць «Прыкладная інфарматыка». У абодвух у школьным атэстаце па матэматыцы — «10», але адзін на ЦЭ набраў 77 балаў, а другі — 98. Зразумела, што ў другога абітурыента значна больш шанцаў на паступленне.

А калі 11-класнік атрымае на ЦЭ 1 або 2 балы — як будзе выстаўляцца адзнака яму ў атэстат? У Міністэрстве адукацыі тлумачаць, што бал, атрыманы на ЦЭ, будзе складвацца з гадавой адзнакай і дзяліцца на два. Напрыклад, калі па ЦЭ выпускнік атрымае 1 бал, а яго гадавая адзнака 3 балы, то сярэдняе арыфметычнае — «двойка». У такім выпадку навучэнец атрымае даведку, з якой можна ісці паступаць толькі ў каледж. Атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі будзе выдадзены, калі сярэдняе арыфметычнае паміж гадавой адзнакай і адзнакай, атрыманай на ЦЭ, па 10-бальнай шкале будзе ад 3 балаў і вышэй. Дарэчы, да ЦЭ таксама дапускаюцца толькі вучні, якія маюць гадавыя адзнакі ад 3 балаў і вышэй.

ПАД ПАТРЭБЫ ЗАКАЗЧЫКАЎ

Яшчэ адна важная адметнасць уступнай кампаніі 2023 года — змяненне ў падыходах да адбору на мэтавую падрыхтоўку ў ВНУ. З аднаго боку, цяпер знятыя абмежаванні на месца знаходжання арганізацыі — заказчыкаў кадраў. Калі раней мэтавая падрыхтоўка распаўсюджвалася толькі на пэўныя населеныя пункты (чарнобыльскія, сельскія рэгіёны, гарады з насельніцтвам да 20 тысяч), то цяпер дагаворы на мэтавую падрыхтоўку могуць заключаць арганізацыі і прадпрыемствы, размешчаныя ў тым ліку ў сталіцы і абласных цэнтрах. Адначасова з гэтым прадугледжана павелічэнне гранічных квот у рамках мэтавай падрыхтоўкі: на сельскагаспадарчых спецыяльнасцях — да 70 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму, па медыцынскіх — да 80 працэнтаў і па іншых спецыяльнасцях — да 60 працэнтаў. Вядома, што 60, 70 і 80 працэнтаў — гэта максімальная планка. І тут ёсць шмат акалічнасцяў. Ці знойдзецца столькі заказчыкаў, гатовых пралічыць свае патрэбы ў кадрах на 4-5 і больш гадоў наперад? Ці будуць гатовыя абітурыенты заключаць дагавор на мэтавую падрыхтоўку? Сёння такія дагаворы заключаюцца на пяць гадоў адпрацоўкі на заказчыка кадраў пасля атрымання вышэйшай адукацыі і на тры гады — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Мэтавая падрыхтоўка мае на ўвазе папярэдняе заключэнне дагавора паміж абітурыентам і заказчыкам кадраў яшчэ да правядзення этапу адбору, а пасля яго ўдалага праходжання — таксама і з ВНУ, дзе будуць рыхтаваць маладога спецыяліста.

Міністэрства адукацыі плануе стварыць базу даных арганізацый — заказчыкаў кадраў, якія выдаюць мэтавыя накіраванні абітурыентам, каб дапамагчы выпускнікам і работадаўцам знайсці адно аднаго. У гэтай базе будуць і ВНУ, і каледжы, дзе таксама вядзецца мэтавая падрыхтоўка.

Некаторыя кіраўнікі могуць прызначыць абітурыенту сумоўе, каб пазнаёміцца з ім бліжэй і ацаніць яго матывацыю. Мабыць, вырашальным фактарам для арганізацыі — заказчыка кадраў з'яўляецца паспяховасць абітурыента. Будучаму работадаўцу важна быць упэўненым, што прэтэндэнт на мэтавае месца зможа не толькі прайсці па конкурсе ў ВНУ або каледж, але і паспяхова скончыць вучобу. Высокія балы па профільных прадметах, наяўнасць грамат і падзячных лістоў будуць на карысць абітурыента.

Традыцыйна высокія конкурсы фарміруюцца ў медыцынскіх ВНУ. А сёлета сталічныя ўстановы аховы здароўя ўпершыню змогуць заказаць для сябе кадры. Паводле інфармацыі, размешчанай на сайце БДМУ, заключыць з абітурыентам дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы могуць арганізацыі пад кантролем упраўленняў аховы здароўя аблвыканкамаў, абласных УП «Фармацыя», абласных цэнтраў гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Актуальная інфармацыя аб заключэнні мэтавых дагавораў з'явіцца на сайтах арганізацый у канцы красавіка. Выдача мэтавых напрамкаў пачнецца ў маі.

Абітурыентам, якія хочуць працаваць ва ўстановах аховы здароўя сталіцы, трэба будзе звярнуцца ў камітэт па ахове здароўя Мінгарвыканкама, у Мінскай вобласці — у галоўнае ўпраўленне аховы здароўя Мінаблвыканкама. Каб у далейшым працаваць ва ўстановах аховы здароўя Гродна, Брэста, Віцебска, Гомеля і Магілёва, трэба звярнуцца ў галоўнае ўпраўленне па ахове здароўя адпаведнага аблвыканкама.

ЗАПАСНЫЯ ВАРЫЯНТЫ ДЛЯ МЭТАВІКОЎ

Яшчэ адзін важны нюанс: тэрміны паступлення на мэтавую падрыхтоўку змяніліся. Падача дакументаў будзе адбывацца з 3 да 8 чэрвеня. У ЦТ удзельнічаць мэтавікам не трэба. З гэтага года прэтэндэнты на мэтавую падрыхтоўку будуць здаваць унутраны экзамен па першым профільным прадмеце (з 4 да 10 чэрвеня). Выпрабаванне пройдзе ў вуснай форме, акрамя спецыяльнасцяў творчага напрамку, а таксама звязаных са спортам, фізічнай культурай і шэрагу іншых. На сайце Міністэрства адукацыі можна знайсці пытанні да экзамену: іх 50 па кожным прадмеце. На экзамене абітурыент выцягне білет і пойдзе рыхтавацца. Для падрыхтоўкі яму выдадуць праштампаваны ліст. Конкурс будзе фарміравацца, зыходзячы з сумы сярэдняга бала атэстата і ўнутранага вуснага экзамену. Такім чынам, усе абітурыенты будуць праранжыраваныя. Залічэнне на мэтавыя месцы — да 13 чэрвеня.

Калі абітурыенты не пройдуць па конкурсе (а такое магчыма, калі на адно месца будзе прэтэндаваць некалькі чалавек), яны змогуць паспрабаваць свае сілы пры паступленні на бюджэтную або платную формы навучання. Для гэтага выпускнікам бягучага года необходна будзе здаць адзін прадмет на ЦТ, таму для падстраховкі ў маі на яго варта зарэгістравацца, каб не ўпусціць сваю магчымасць. Ці можна задзейнічаць варыянт з паступленнем на спецыяльнасці, дзе праводзіцца ўнутраны экзамен.

Інавацыі ў адукацыі

ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ: КРОК У ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

Цэнтр робататэхнікі і штучнага інтэлекту адкрыўся ў БДУ. Яго стварэнне абумоўлена ўзрослай патрэбай у шматпрофільных ІТ-спецыялістах, якія валодаюць кампетэнцыямі ў сферы робататэхнікі і штучнага інтэлекту. Робататэхніка імкліва развіваецца ва ўсім свеце. Гэта шматгранная галіна, бо робаты і аўтаматызаваныя сістэмы выкарыстоўваюцца цяпер практычна ўсюды, уключаючы медыцыну і вытворчасць.

Развіццё гэтага напрамку ў БДУ з'яўляецца перспектыўным дзякуючы напрацаванай магутнай фундаментальнай матэматычнай базе. Студэнты з'яўляюцца ўдзельнікамі і прызёрамі міжнародных алімпіяд і конкурсаў па праграмаванні і робататэхніцы. Сярод іх — «ІТ-Планета», WRO, SAP Leonardo Hackathon, FIRST Global Challenge і інш.

Інавацыйны цэнтр стане міждысцыплінарнай пляцоўкай для навучання будучых праграмістаў, матэматыкаў, біёлагаў, фізікаў, хімікаў і юрыстаў. Для студэнтаў распрацаваны спецкурс, у рамках якога яны атрымаюць кампетэнцыі, неабходныя для будучай прафесіі ва ўмовах лічбавай трансфармацыі. На лекцыйных, практычных і лабараторных занятках студэнцкая моладзь зможа вывучаць асновы данага напрамку, падыходы да мадэлявання прылад на базе сучасных праграмных платформ і тэхнічных рашэнняў.

Цэнтр аснашчаны сучаснымі робататэхнічнымі стэндамі. Гэта тры макеты для візуальнай дэманстрацыі бартавых сістэм кіравання робатамі і вывучэння сістэмы іх функцыянавання, канструктары для зборкі прататыпаў сэрвісных мабільных робатаў і калабаратыўны робат-маніпулятар. Апошні ўяўляе сабой механічны аналаг чалавечай рукі, які дазваляе рабіць захоп прадметаў з далейшым іх утрыманнем і перасоўваннем у прасторы.

Для арганізацыі навучальнага працэсу навукоўцы ФПМІ БДУ і Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі распрацавалі вучэбна-метадычны комплекс па курсе «Мадэляванне і праграмаванне ў асяроддзі ROS робататэхнічных прылад». Таксама плануецца правядзенне адукацыйных семінараў у галіне робататэхнікі і штучнага інтэлекту для выкладчыкаў універсітэта. Акрамя таго, у найбліжэйшай перспектыве ў цэнтры будзе арганізавана навучанне для старшакласнікаў.

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Бачыць мэту

САМ З «ВУСАМІ»

Знаёмімся з самым юным барберам Беларусі

Каля дзесяці гадоў таму ў нашай краіне адрадзілася мода на вусы і бараду. Разам з гэтым стала запатрабаванай прафесія барбера, і для мужчын паўсюль пачалі адкрывацца барбершопы.

У Маладзечне вучыцца і працуе самы юны барбер Беларусі Арцём АЎРАЙЦЭВІЧ. Цікавасць да гэтай справы ў яго з'явілася задоўга да паступлення ў Маладзечанскі дзяржаўны каледж. У 11 гадоў хлопчык упершыню трапіў у барбершоп, і ўбачанае яго зацікавіла. Ён стаў назіраць за працай майстроў, рабіў замалёўкі, вывучаў матэрыялы інтэрнэту. Першым «кліентам» быў яго малодшы брат. Скончыўшы спецыяльныя курсы, 14-гадовы юнак адкрыў уласную цырульню пад назвай Landspa. Салон карыстаецца вялікай папулярнасцю, і за два гады ў хлопца з'явілася мноства пастаянных кліентаў, якія заўсёды задаволены вынікам.

Аднак Арцём увесь час павышае свой прафесійны ўзровень.

— Мода не стаіць на месцы, і калі не ўдасканальвацца, то ты застанешся ззаду ўсіх, — лічыць юнак.

Хлопец часта ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, і яшчэ не было выпадку, каб ён вярнуўся дамоў без узнагароды. Найбольшае ўражанне на юнага майстра

зрабіў фестываль «Неўскія берагі» ў Санкт-Пецярбургу. Нягледзячы на вялікую канкурэнцыю сярод прафесіяналаў і тое, што Арцём быў адзіным школьнікам, ён усё ж заняў сваё заслужанае першае месца. А два гады таму юнаку ўру-чылі Рэспубліканскую маладзёжную прэмію ў намінацыі «Fashion».

— Усе ўзнагароды для мяне значныя. Цяжка вылучыць адну. У кожнага конкурсу ёсць свая «фішка», і ўсюды я выкладваюся на ўсе сто, — кажа хлопец.

Бацькі заўсёды падтрымлівалі выбар сына, а вось сябры часам усміхаліся, на што Арцём адказваў, што прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва таксама павінны сачыць за сабой, за тым, як яны выглядаюць.

Паслугі барбера каштуюць нятанна, але часам майстар робіць бясплатныя стрыжкі. Аднойчы ён адправіўся ў Радашковіцкую школу-інтэрнат для дзяцей сірот і зрабіў хлапчукам свае любімыя модныя стрыжкі «Кроп» і «Андэркат», а ахвотным — яшчэ і Hair tattoo.

Юнак лічыць, што барберам можа стаць любы, галоўнае — мець цікавасць. Але, гледзячы на працу Арцёма Аўрэйцэвіча, я б з ім паспрачалася. У яго, безумоўна, ёсць талент.

Лаліта ЯБЛОНСКАЯ, вучаніца 10 класа СШ № 1 г. Маладзечна.
Фота з архіва героя.

Лакацыі актыўнасці

«ЗАЛІКОВАЯ РАЗМОВА»

Інфармацыйна-асветніцкі праект пад такой назвай для студэнцкай і навучэнскай моладзі стартаваў у краіне. Гэта грамадская ініцыятыва, якая складаецца з цыкла сустрэч лідараў меркаванняў з мэтавай аўдыторыяй: студэнтамі ВНУ і навучэнцамі каледжаў.

На базе ўстаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў фармаце адкрытага дыялогу вядомыя людзі — палітолагі, кіраўнікі і палітычныя аглядальнікі вядучых сродкаў масавай інфармацыі краіны, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса, грамадскіх арганізацый — будуць праводзіць сустрэчы з моладдзю. Зацікаўленая аўдыторыя — гэта прадстаўнікі ўсіх курсаў і факультэтаў, грамадскіх арганізацый, маладзёжнага актыву.

Тэматыка сустрэч закране актуальныя грамадска-палітычныя пытанні. Так, у цэнтры абмеркавання будзе ваенна-палітычная абстаноўка вакол Беларусі і ў сумежных краінах, сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай краіны ва ўмовах санкцыйнага ціску.

Эксперты раскажуць маладым людзям аб ключавых дасягненнях Беларусі ў розных галінах, умовах, якія стварае дзяржава для развіцця патэнцыялу беларускай моладзі. Не застанецца без увагі і такі важны аспект, як прававое супрацьдзеянне дэструктыўнай ідэалогіі і меры, якія прымаюцца па яго забеспячэнні.

Першая «Заліковая размова» адбылася ў Мінскім дзяржаўным каледжы аўтамабілебудавання з удзелам першага сакратара Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандра Лук'янава.

Дарэчы, мерапрыемствы інфармацыйна-асветніцкага праекта для студэнцкай і навучэнскай моладзі на працягу трох месяцаў пройдуць ва ўсіх ВНУ і сярэдніх спецыяльных установах краіны.

Галоўная задача «Заліковай размовы» — не толькі праінфармаваць аб бягучай абстаноўцы ў краіне, але і атрымаць зваротную сувязь ад моладзі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Камертон настрою

ПАСПРАБАВАЦЬ СЯБЕ Ў ТВОРЧАСЦІ

Прыём заявак на ўдзел у Рэспубліканскім літаратурным конкурсе «БрамаМар» стартаваў у БДУ. Да ўдзелу запрашаюцца вучні 9—11 класаў, студэнты і магістранты, якія імкнуцца рэалізаваць сябе ў творчасці і павысіць літаратурнае майстэрства.

Школьнікам прапануюцца намінацыі «Паэзія» і «Проза», а студэнты і магістранты дадаткова прадставяць тэксты ў катэгорыях «Драматургія», «Мастацкі пераклад», «Крытыка». Усе работы ацэніць журы ў складзе вядомых беларускіх літаратараў, крытыкаў і драматургаў.

Творы прымаюцца да 15 сакавіка па электроннай пошце ramamar2023school@gmail.com (для школьнікаў), bramamar2023student@gmail.com (для студэнтаў). Патрабаванні да афармлення тэкстаў размешчаны ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» (https://vk.com/bramamar).

Для найлепшых аўтараў з мэтай удасканалення іх літаратурнага майстэрства ў сакавіку арганізуюць тэматычныя майстар-класы і варкшопы. Лаўрэаты конкурсу атрымаюць дыпломы пераможцаў, а ўсе ўдзельнікі — сертыфікаты.

Літаратурны конкурс «БрамаМар» ініцыяваны студэнтамі факультэта журналістыкі ў 2010 годзе. У 2018 годзе яму афіцыйна нададзены статус рэспубліканскага. Штогод у творчым спаборніцтве бяруць удзел больш за 300 студэнтаў, магістрантаў і школьнікаў з усёй краіны.

Арганізатарам выступае факультэт журналістыкі БДУ.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З «базай» у галаве

ІНКУБАТАР ДЛЯ ІНЖЫНЕРНАЙ ЭЛІТЫ

БДУІР і вядучае праектна-канструктарскае прадпрыемства ААТ «Пеленг» падпісалі пагадненне аб стварэнні сумеснага вучэбна-даследчага «Цэнтра інавацыйных тэхналогій БДУІР-ПЕЛЕНГ». Ён стане базай для профільнай падрыхтоўкі інжынераў для прадпрыемства і сувязным звяном паміж адукацыйным працэсам ва ўніверсітэце і вытворчасцю высокатэхналагічнай прадукцыі.

— Да работы ў цэнтры будуць прыцягвацца не толькі нашы спецыялісты, але і эксперты з боку «Пеленга». Гэта пляцоўка ствараецца для самарэалізацыі студэнтаў і работы над перспектыўнымі інавацыйнымі праектамі, — адзначыў рэктар БДУІР Вадзім Богуш. — Іх тэматычная накіраванасць будзе звязана са сферай оптаэлектроннага прыборабудавання, дзе «Пеленг» з'яўляецца не толькі беларускім лідарам, але і вядучым прадпрыемствам сусветнага ўзроўню.

У рамках дагавора аб стварэнні сумеснага цэнтра ААТ «Пеленг» — аснасціць у БДУІР некалькі даследчых лабараторый абсталяваннем і ўсім неабходным для выканання работ. Спецыялісты прадпрыемства будуць прымаць актыўны ўдзел у вызначэнні тэматыкі вучэбна-даследчых праектаў і складанні тэхнічных заданняў, а студэнты і школьнікі атрымаюць магчымасць удзельнічаць у тэхнічных гуртках і працаваць над рэальнымі праектамі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў універсітэта і супрацоўнікаў прадпрыемства. Для школьнікаў на базе цэнтра плануецца рэалізацыя спецыяльнай праграмы адбору кандыдатаў на мэтавую падрыхтоўку.

«БДУІР з 2014 года рэгулярна выконвае навукова-даследчыя работы для «Пеленга». У іх актыўна ўдзельнічаюць студэнты, пачынаючы з другога курса. Найлепшыя размяркоўваюцца потым на «Пеленг». Такім выпускнікам патрабуецца менш часу на адаптацыю на працоўным месцы, — адзначыў загадчык кафедры інфакамунікацыйных тэхналогій Віктар Цвяткоў. — Цяпер з'явілася новая мэта — паглыбіць профільную падрыхтоўку інжынераў па кірунках «Радыётэхніка», «Сістэмы кіравання», «Вылічальная тэхніка», «Інфакамунікацыі». Для гэтага і ствараецца вучэбна-даследчы «Цэнтр інавацыйных тэхналогій БДУІР-ПЕЛЕНГ».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Нечакана!

ПРАВА — ДЛЯ КАСМІЧНАЙ ПРАСТОРЫ

Аспірантка факультэта міжнародных адносін БДУ Дар'я Богдан распрацавала бясплатны анлайн-курс па касмічным праве.

Адукацыйны праект накіраваны на папулярызацыю ўнікальнай галіны права, якая рэгулюе дзейнасць дзяржаў і прыватных асоб па даследаванні і выкарыстанні касмічнай прасторы, Месяца і іншых нябесных цел. Гэта галіна права грунтуецца на міжнародных дагаворах, нацыянальных заканадаўчых актах і актах міжнародных арганізацый.

На анлайн-платформе GoogleClassroom размешчаны тэарэтычны матэрыял па пяці тэмах: «Уводзіны і крыніцы права», «Здабыча касмічных рэсурсаў», «Статус касманаўтаў», «Рэгістрацыя і запуск спадарожнікаў», «Адказнасць за дзейнасць».

У фармаце прэзентацый, схем, табліц і відэаматэрыялаў у даступнай форме на рускай і англійскай мовах расказваецца аб самых важных аспектах міжнароднага і нацыянальнага касмічнага права, камерцыялізацыі касмічнай дзейнасці, выкарыстанні сыравінных, прасторавых, энергетычных рэсурсаў і інш. Таксама ёсць «Бонусныя ўрокі» аб кампенсацыі шкоды, нанесенай кіберсродкамі, і развіцці сферы касмічных паслуг у Еўразійскім эканамічным саюзе. Пасля вывучэння тэарэтычных матэрыялаў можна ацаніць свае веды, выканаўшы праверачныя тэсты.

Акрамя таго, курс змяшчае раздзел з карыснай тэматычнай літаратурай, дзе прадстаўлены электронныя кнігі і навуковыя публікацыі.

«Адукацыйная праграма стала вынікам работы «Школы касмічнага права» на ФМА, адкрытай у 2018 годзе, — адзначае Дар'я. — У перыяд пандэміі мы перайшлі на анлайн-заняткі і пашырылі іх тэматыку. Так з'явілася ідэя стварыць анлайн-курс, слухачамі якога, як я з задавальненнем назіраю, становяцца ўсе ахвотныя, незалежна ад іх месца навучання і знаходжання».

Трэба дадаць што Дар'я Богдан у складзе каманды ФМА БДУ заваявала тытул чэмпіёна Еўропы і стала ўладальнікам «Найлепшай пісьмовай пазіцыі» міжнароднага конкурсу па касмічным праве імя М. Лахса ў 2018 годзе.

З дадатковымі пытаннямі да аўтара курса можна звярнуцца па электроннай пошце spacelawschool@gmail.com.

Плануецца, што напярэдадні Дня касманаўтыкі, 12 красавіка, адбудзецца вочная лекцыя па найбольш актуальных тэмах развіцця касмічнага права.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Новыя старты

Спаборніцтвы смелых

Сёння ў Гомелі пройдзе абласны злёт маладзёжных атрадаў аховы правапарадку «Час смелых». Мерапрыемства адбудзецца на базе вайсковай часці 1242.

У праграме злёту запланавана пастраенне ўдзельнікаў атрадаў, экскурсія па тэрыторыі вайсковай часці, а таксама прафарыентацыйныя спаборніцтвы: выкананне нарматываў па агнявой падрыхтоўцы (зборка-разборка аўтамата Калашнікава), стральба на оптыка-электронным трэнажоры, праходжанне квэсту з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў пагранічнага кантролю, праходжанне спартыўнай эстафеты ў спартыўнай зале вайсковай часці, выкананне нарматываў па радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароне.

У мерапрыемстве прымуць удзел каля 80 членаў маладзёжных атрадаў аховы правапарадку з усіх рэгіёнаў Гомельскай вобласці ў дзвюх узроставых групах: ад 14—18 гадоў і ад 18 і вышэй.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

Іван ЯНКОЎСКІ:

«ХТО ЎМЕЕ НАВАТ ПАКІДАЦЬ ГАЛАВУ

У вялікім спорце выпадковых людзей не бывае, бо спорт — не толькі колькасць заваяваных медалёў, гэта і характар, асаблівы падыход да жыцця, успрымання свету і людзей. І нават калі чэмпіёнам стаць не наканавана, ёсць магчымасць праявіць сябе. Адданасць справе, любоў да яе і ўпартая праца заўсёды ўзнагароджваюцца. А людзі, якія жывуць спортам, заўсёды будуць яму патрэбны незалежна ад колькасці медалёў.
Іван Янкоўскі ў бытнасць спартсменам перамагаў на шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных стартах. Але на самых галоўных — чэмпіянатах свету і Еўропы — кожны раз спыняўся за крок ад перамогі. Чэмпіянаты Еўропы 2012 і 2014 гадоў прынеслі яму бронзавыя медалі, у 2016 ён дабраўся да «серабра». З-за сур'ёзнай траўмы калена не змог выступіць на самым галоўным старце — Алімпійскіх гульнях 2016 года. Залячыўшы траўму, вярнуўся ў спорт. Узнагародай за мужнасць і цярпенне стаў сярэбраны медаль чэмпіянату свету 2018 года — ізноў зусім крыху не хапіла да перамогі. І, тым не менш, у беларускай вольнай барацьбе Іван Янкоўскі — фігура прыкметная. А рэваншу за яго нерэалізаваныя здольнасці сёння бяруць члены нацыянальнай зборнай па вольнай барацьбе, якую ў 2019 годзе ўзначаліў той самы 32-гадовы Іван Янкоўскі. Для такой пасады ў спорце — вельмі малады ўзрост. Але ж галоўнае — не лічбы ў пашпарце, а досвед і падыход да працы. Аб чым думае і як жыве чалавек, які адказвае за спартыўныя лёсы многіх людзей?

Я АБРАЎ СПАРТЫЎНАЕ ЖЫЦЦЁ З ВАР'ЯЦКІМІ НАГРУЗКАМІ

«У зале барацьбы ўпершыню ў жыцці ўбачыў, як цяжкая, знясільвальная праца можа прыносіць задавальненне. Як зачараваны, я, сямігадовы, глядзеў на моцных духам, дужых спартсменаў на дыване. Яны былі потныя, стомленыя, але іх вочы гарэлі, яны кайфавалі ад таго, што робяць. І мне так спадабалася гэтая мужчынская атмасфера сілы, барацьбы, эмоцый, што я ўлюбіўся ў барацьбу з першага погляду. Дзякуй за гэта варта сказаць маім старэйшым братам, роднаму і стрыечнаму, якія займаліся гэтым відам спорту ў Анатоля Іванавіча Ермака. Менавіта яны прывялі мяне ў залу. Я з першых дзён уключыўся ў трэніроўкі, і нават думкі не ўзнікала сысці.

Ключавая фігура для развіцця юнага спартсмена — трэнер. Да яго прыходзіць дзіця, у якога мышцы і звязкі не сфарміраваны, падаць ён не ўмее, характар не развіты. Калі трэнер няправільна падыдзе да трэніровак — могуць быць сур'ёзныя наступствы. Спачатку дзяцей вучаць куляцца, развіваюць каардынацыю, расцяжку. Магчыма, гэта не так цікава, як сама барацьба. І трэнер павінен не перагнуць палку, каб захаваць жаданне, утрымаць, бо дзіця выбірае не від спорту, а трэнера, які і ўлюбляе ў свой спорт. Таму паразуменне паміж трэнерам і спартсменам — аснова. Анатоль Іванавіч Ярмак улюбіў мяне ў барацьбу, мы адразу знайшлі агульную мову. Ён вёў мяне ўсю маю спартыўную кар'еру. У барацьбе рэдка бывае, калі першы трэнер працуе са спартсменам ва ўсіх узростах.

У 10 класе прыйшлося зрабіць самы важны ў жыцці выбар: ісці ў вучылішча алімпійскага рэзерву і цалкам прысвячаць сябе спорту ці шукаць нешта іншае. Акрамя мяне на гэтае пытанне ніхто б не адказаў. І я абраў спартыўнае жыццё з двухразовымі трэніроўкамі, вар'яцкімі нагрузкамі і вучобай паміж імі. Сыходзіў з дому раніцай, вяртаўся позняй вечарам. Усяго сябе аддаваў барацьбе, вучоба ў школе таксама патрабавала часу і сіл. Але я не скардзіўся, разумеў, на што іду, і быў гатовы.

Пасля першага медаля чэмпіянату Еўропы стала дыхаць лягчэй. «Бронза» чэмпіянату Еўропы 2012 года стала вельмі дарагой і доўгачаканай. Мне было 25 гадоў, за плячыма ўжо — шэсць чэмпіянатаў Еўропы, і кожны раз зусім крыху не хапала да медаля. Ужо нават былі думкі заканчваць з барацьбой, раз не атрымліваецца. Здаецца, і на буйных турнірах моцных барцоў перамагаю, і ў форме добрай, а прыязджаю на чэмпіянат Еўропы — і нічога. У 2012 годзе я думаў толькі пра медалі і ні пра што болей. Разумеў: ці зараз, ці ніколі. На шчасце, тым разам у мяне атрымалася ўвайсці ў прызёры. Калі мне на шыю павесілі медаль чэмпіянату Еўропы — нібы гара з плячэй. Я быў вельмі зацыклены на медалі, і на мяне гэта ціснула. Таму пасля першай узнагароды змагацца стала лягчэй псіхалагічна.

Атрымаў траўму, выступіў, але прайграў. На жаль, праз няўдалы збег абставін я не выканаў самай галоўнай спартыўнай мары — не рэалізаваў сябе на Алімпійскіх гульнях. У 2012 годзе перад Лонданам у мяне не было шанцаў: занадта малады. Ды можна было адабрацца ў Рыа-дэ-Жанэйра. На ліцэнзійным турніры я ўпэўнена выйграваў схватку, але дапусціў маленькую, нязначную памылку, прапусціў прыём і прайграў. Быў шанц узяць ліцэнзію на турніры ў Турцыі. На трэніроўцы нага захрасла паміж дыванамі, калена выскачыла з сустава, як вынік — разрыў меніска. Але ўсё ж я выйшаў барацца. Для ліцэнзіі трэба было заняць першае-другое месца. А я быў на трэцім. І зноў не хапіла зусім няшмат...

«Ваня, ты занадта адказны, і гэта на цябе цісне», — сказаў мне адзін знаёмы трэнер. Магчыма, калі б быў менш адказны, менш зацыклiваўся, усё магло быць інакш.

Я вельмі хацеў завяваць медаль — ніякіх іншых думак. І на найважнейшых стартах гэта адыграла са мной злы жарт. Часам карысна менш думаць аб выніку. Ты ўжо адпахаў, выканаў свой аб'ём нагрузак. Усё, што застаецца, — выходзіць і бараціа, лішні раз не асцярожнічаючы, не баючыся рабіць прыёмы. Ты іх ведаеш, мозг ведае, калі які прыём зрабіць. Не трэба забіваць галаву лішнімі думкамі. Гэта стопарыць, не дазваляе лішні раз рызыкнуць. У барацьбе вельмі важная рэакцыя, а каб хутка рэагаваць, трэба, каб мозг не быў забіты. У нас найскладанейшы від спорту, дзе вынік можа вырашыцца за долі секунды. Трэба быць больш раскаваным, больш даверыць сабе».

«НАМ ПАТРЭБНЫ ГАЛОЎНЫЯ СТАРТЫ — ЧЭМПІЯНАТ ЕЎРОПЫ І ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ»

Беларуская школа вольнай барацьбы — з'ява ўнікальная з вельмі цікавым дзвізам — «Беларусаў на дыване лепш не злаваць». У гэтым не раз пераконваліся сапернікі галоўнай легенды беларускай барацьбы Аляксандра Мядзведзя, пазней — Сяргея Смаля, затым Мурада Гайдарава і Ібрагіма Саідава. Праўда, пасля трох алімпійскіх перамог Аляксандра Мядзведзя ў айчыннай вольнай барацьбе былі толькі прызёры Алімпійскіх гульняў, але не чэмпіёны. Выправіць гэту задачу — адказнасць маладога пакалення трэнераў і спартсменаў, на чале якіх Іван Янкоўскі. У 2019 годзе тады яшчэ дзеючаму спартсмену прапанавалі ўзначаліць нацыянальную каманду. «Праверкай боем» адразу стаў чэмпіянат Еўропы 2020 года. Яна была ўдалай: Магамедхабіб Кадзімагамедаў стаў чэмпіёнам, Нюргун Скрабін — сярэбраным прызёрам, Расул Ціхаеў і Амаргаджы Мамедаў — бронзавымі. Але галоўны экзамен чакаў на Алімпійскіх гульнях у Токіа. Вынік — «серабро» Магамедхабіба Кадзімагамедава. З таго часу беларускія «вольнікі» амаль на кожным турніры завaёўваюць медалі. Самы «свежы» прыклад — міжнародныя спаборніцтвы па вольнай барацьбе «Кубак Івана Ярыгіна», за медалі якога ў студзені змагаліся больш за 400 барцоў з 12 краін. Беларус Дзяніс Храмянкоў (катэгорыя да 125 кг) стаў пераможцам турніру.

«У 2019 годзе нічога не прадвяшчала перамен. Пасля няўдалай алімпійскай кваліфікацыі я заняў трэцяе месца на турніры ў Якуціі, выйграў турнір у Кемераве. Усё было спакойна, пакуль мне не патэлефанаваў Камандар



Бафаліевіч Маджыдаў, на той момант старшыня федэрацыі барацьбы, і не запрасіў на размову. Чакаў чаго заўгодна, але толькі не прапановы ўзначаліць зборную. Гэта было так нечакана, што я нават разгубіўся. Вядома, разумеў, што рана ці позна мне давядзецца завяршыць спартыўную кар'еру. Але ідэй, чым буду займацца пасля, не было. І ўжо тым больш не меркаваў, што мне вось так з ходу прапануюць стаць галоўным трэнерам, думаў, максімум — памочнікам. Я разумеў, што другі раз такую прапанову не атрымаю, усведамляў усю ступень адказнасці. Я не першы год у спорце і выдатна разумею, што немагчыма працаваць з камандай і цалкам аддавацца сваёй падрыхтоўцы. Таму прапанову кіраўніцтва я прыняў і завяршыў сваю спартыўную кар'еру. І гэта было правільна. Шанцаў адабрацца на Алімпійскія гульні ў Токіа ў мяне было няшмат, даваў аб сабе ведаць узрост, на пяткі наступалі малады спартсмены.

Я разумеў, што пры дрэнным збегу абставінаў праз паўгода мая трэнерская кар'ера можа скончыцца. Мяне прызначылі галоўным трэнерам зборнай за паўгода да Алімпійскіх гульняў. А ў няўдачах каманды заўсёды вінаваты трэнер, і ніхто б не стаў разбірацца, колькі часу я працую. Я ўсведамляў ступень адказнасці, але раз ужо ўзяўся — выконвай. У маім выпадку пераносе Алімпійскіх гульняў на год пайшоў нават на карысць. Мы добра выступілі ў 2020 годзе: заваявалі чатыры медалі на чэмпіянаце Еўропы, тры медалі на Кубку свету. І я разумеў, што ў нас будуць алімпійскія ліцэнзіі. Спартсмены ўзялі чатыры ліцэнзіі з шасці магчымых. Ліч, што гэта вельмі добры вынік. Тэарэтычна маглі б і больш, але, чаго ўжо граху ўтойваць, маглі б і менш.

Адпраўляючыся на Алімпійскія гульні ў Токіа, я інтуітыўна адчуваў, што ў нас будзе добры вынік. У Токіа паехалі чатыры моцныя спартсмены. І я разумеў, што медаль будзе. Алі Шабанаў прайграў спартсмену, які заняў трэцяе месца, схватка была зусім роўная. Саша Гуштын таксама бронзававму прызёру саступіў зусім крышачку. Дзяніс Храмянкоў перагарэў і набрабіў дурных памылак, а мог бы смела змагацца за пападанне ў тройку. Ну, Магамедхабіб Кадзімагамедаў, вядома, выдатна сябе праявіў.

Сярэбраны прызёр — гэта той, хто прайграў за перамогу. Многія, дарэчы, дзівіліся, чаму, маючы сярэбраны медаль Алімпійскіх гульняў, Магамедхабіб выглядае такім засмучаным. Ён стан могуць зразумець толькі барцы. Ён вельмі хацеў «золата», у яго для гэтага ўсё было. Але не склалася. Тыя, хто выходзіць у фінал, учора ўжо завяваялі медаль, яны разумеюць, што ён сто працэнтаў у іх ёсць. Таму на вырашальную схватку выходзяць з думкамі выключна аб «золаце». А калі прайграеш, то чаму тут радавацца? Так, ты сярэбраны прызёр, але ты прайграў.

Як бы балюча не было прайграваць спартсмену, трэнеру яшчэ горш. Бывае, спартсмен такую памылку дапускае, што мне хочацца скрозь зямлю правалiцца. А ён яе можа нават не заўважыць, у яго ўсё нармальна. Не перадаць словамі пачуцці, калі барэц робіць ну вельмі дурныя памылкі, якія ўсё псуюць. Але гэта і ўрок для самога трэнера. Трэба некалькі сцэнарыяў схваткі прапрацоўваць, усе варыянты развіцця сітуацыі. Можна плануваць адно, а схватка пойдзе зусім па іншым сцэнарыі, іх можа быць незлічонае колькасць і да кожнага трэба быць гатовым. Мы выступаем на пульсе каля 200 удараў у хвіліну, мышцы акісляюцца, забіваюцца. І ў гэтым стане мозг павінен працаваць на максімуме. Тыя, хто ўмее нават у самых непрадказальных сітуацыях пакідаць галаву светлай, становяцца чэмпіёнамі.

Барацьба — вельмі цяжкі від спорту, як, па сутнасці, любы іншы. Але, каб зразумець наколькі, трэба самому прайсці гэты шлях. У барацьбе цябе ўвесь час кідаюць, б'юць, на арганізме гэта адбіваецца. Пры гэтым ты павінен усебакова развівацца: трэніраваць гнуткасць, каардынацыю, рэакцыю. І ў патрэбны момант уключаць усе гэтыя якасці. Не ўяўляю, хто можа сказаць, што гэта лёгка. Адзінаборствы — цяжкая праца. Таму, паклаўшы руку на сэрца, бароцца мяне ўжо не цягне. Бывае, выйдзеш на дыван з хлопцамі паштурхацца, там усе балячкі высковаюць, і рэзка жаданне знікае.

Мне прыемна, што маім сынам неабыякавая барацьба. Яны глядзяць спаборніцтвы па тэлевізары, перажываюць за нашых спартсменаў. Я часам бяру іх з сабой у «Стайкі». Але старэйшы абраў хакей, яму падабаецца, і няхай займаецца. Не хачу сваіх дзяцей прымушаць. Няхай займаюцца тым, што ім па душы. З-пад палкі нічога не атрымліваецца, сэнсу ў гэтым няма. А калі зразумеюць, што прызванне — барацьба, я толькі падтрымаю і дапамагу. Вучу сваіх сыноў усё рабіць да канца, бо галоўнае — гэта цярпенне. Асабліва ў спорце. Наверх падымаецца толькі той, хто ўмее цярпець.

Каб выхоўваць сваіх моцных барцоў, павінна супадаць жаданне і трэнера, і спартсмена. А ў многіх яно знікае, як толькі яны разумеюць, які аб'ём нагрузак трэба выконваць. І гэта вялікая праблема для развіцця барацьбы. Многія не вытрымліваюць, і мы губляем патэнцыяльных спартсменаў, а трэнер іх утрымаць не можа. Ва ўсіх павінна быць накіраванасць на вынік. Калі ў спартсмена ёсць жаданне чагосьці дамагчыся, і гэта дапамагае яму працаваць, ён абавязкова даб'ецца выніку. Ёсць таленавітыя хлопцы, але гультаі, і гэта ім перашкаджае. А ёсць менш таленавітыя, але аратыя па натуры. Яны будуць біцца да апошняга, выкладвацца па максімуме. Задача трэнера — да кожнага такога спартсмена знайсці падыход.

У нас ёсць вялікая праблема — мы не можам давесці спартсменаў да патрэбнага ўзросту. Дзяніс Храмянкоў, Аляксандр Гуштын, Магамедхабіб Кадзімагамедаў, Арыян Цютрын — нашы лідары. Яны могуць і павінны адабрацца на Алімпійскія гульні і паказаць там высокі вынік. Дыван пакажа, як усё будзе складвацца. У камандзе ёсць вопытныя спартсмены, і моладзь мы нядрэнную выхоўваем. Але нам трэба моладзь утрымаць. Я першы важны медаль завяваў у 25 гадоў. Наша вялікая праблема ў тым, што мы не можам да гэтага ўзросту хлопцаў давесці, яны не вытрымліваюць адсутнасці выніку і проста сыходзяць са спорту. Але трэба цярпець, сціснуўшы зубы, трэніравацца. І бацькі, і трэнеры павінны ўсяляк падтрымліваць маладога спартсмена. І, зразумела, ён сам павінен стараціа. Калі гэты пазл складзецца, будзе і поспех.

Спартсменам трэба ведаць дату важнага старту. Амаль год як мы знаходзімся ў міжнародным бане. За гэты час нядрэнна выступілі на шасці міжнародных турнірах, не ўлічваючы нашы рэспубліканскія спаборніцтвы. Напрыклад, у верасні на міжнародным турніры на прызы Аляксандра Мядзведзя перамаглі Магамедхабіб Кадзімагамедаў (да 79 кг), Дзяніс Храмянкоў (да 125 кг), «серабро» ў Андрэя Карпача (да 79 кг), Віталь Ігнатовіч (да 79 кг), Адлан Тасуеў, Аркадзь Пагасян (абодва — да 92 кг) і Віталь Песняк (да 125 кг) заваявалі «бронзу». У кастрычніку на турніры ў Якуціі Арыян Цютрын (да 57 кг) стаў пераможцам, у гэтай жа катэгорыі Дзімчык Батамункуеў заняў трэцяе месца. У Андрэя Бекранёва (да 61 кг) «бронза», у Сашы Гуштына (да 97 кг) — «серабро». Мы нічога не страцілі ў спаборніцкай практыцы. Хлопцы ў добрай форме. Але, калі надыходзіць важная дата старту, яны мабілізуюцца, збіраюцца, арыентуюцца на працу. Нам патрэбны галоўныя старты — чэмпіянат Еўропы і свету. Цяпер няма таго агню, запалу, і гэта адчуваецца. Але, мяркуючы па выніках, сёлета спартсмены паказалі добрую гатоўнасць. Моладзь ездзіла на турніры і прыязджала адусюль з медалямі. Няхай прывозілі не россыпі узнагарод, але пустымі не вярталіся. Значыць, мы ўсё робім правільна».

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота дадзены героем.

Аўдыёверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zvizda.by.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпавednасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 23 февраля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименования предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.

ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 7; 22; 29; 50) со снижением цены на 70 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021 г. № 184 (29553).
ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 8–16; 21, 24, 25; 27, 30; 32–35; 42–48, 50) со снижением цены на 70 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.01.2022 г. № 15 (29637).
ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 72 единиц оборудования (№№ лотов 10, 11, 15–17, 21, 23–84) со снижением цены на 65 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810).

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 23 февраля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 65 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объекты продажи **(лоты №№ 2–5)** будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельным участком под объекты продажи прилагается). **Информация о земельном участке: лоты №№ 2–5** расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **8,5646 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания производственных зданий завода (для размещения объектов промышленности)

2	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14065**, площадью **1 159,5 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административно-бытовое здание.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/10. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 16.11.2015 № 320-00035/15-01 договор о залоге (ипотека)	115 500,00	**11 550,00**
3	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14066**, площадью **1 553,2 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административно-бытовое здание с пристройкой.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека)	128 450,00	**12 845,00**
4	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14068**, площадью **10 036,2 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание цеха новой техники с кирпичной отапливаемой пристройкой для ремонта шаровых кранов.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека)	530 950,00	**53 095,00**
5	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14108**, площадью **12 563,1 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **цех металлоконструкций.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/9. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 24.02.2016 № 320-00003/16-01 последующий договор об ипотеке, договор об ипотеке от 30.05.2016 № 320-00013/16-01	631 050,00	**63 105,00**

Продавец: Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09 Григорович Павел Карлович.**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»);** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893, к/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **9 февраля 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 февраля 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Сур'ёзнасць праблемы прызнаў колішні польскі міністр сельскай гаспадаркі Ян Кышштаф Арданоўскі (член кіруючай партыі «Права і Справядлівасць»), ён узначальваў ведамства з 2018-га да 2020-га года. Выступаючы на радыё, экс-міністр, які мае магчымасць казаць больш адкрыта, чым дзеючыя члены ўрада, паскардзіўся на магутнае лобі транснацыянальных карпарацый, што нажываюцца на бедах польскіх фермераў. Аб цікавасці буйных карпарацый да імпарту нізкаякаснага ўкраінскага збожжа сталі казаць яшчэ мінулай вясной, калі найлепшыя шляхі такога вывазу толькі абмяркоўваліся. У маі 2022-га кіеўскі журналіст Дзмітрый Васілец апісаў яго схему на прыкладзе агрохолдынга «Нібулон» — аднаго з найбуйнейшых дзеючых ва Украіне. «Велізарная доля аграсектара замацавана за гэтай карпарацыяй. Калі прыгледзецца больш уважліва да гэтай нібыта ўкраінскай кампаніі, можна ўбачыць, што ЕБРР на рэгулярнай аснове выдае «Нібулону» сотні мільёнаў долараў крэдытаў. Пазыкі назапасіліся гіганцкія, а набіраліся яны ў тым ліку і пад ураджай. Атрымліваецца, што збожжа, сабранае «Нібулонам», даўно не належыць украінцам. Яго вырошчваюць тут, пасля чаго вывозяць за мяжу. Тое ж самае адбываецца і з іншымі агрохолдынгамі. Калі раней крэдыторы забіралі толькі частку даўно фактычна выкупленага тавару, то цяпер у сувязі з тым, што адбываецца, вырашылі вывезці абсалютна ўсё, — заўважыў Дзмітрый Васілец. — Гэта бізнес. Транснацыяналам пляваць на мірных украінцаў, асуджаных на гібель ад голаду».

Доктар палітычных навук, прафесар СПбДУ Наталля Яроміна адзначыла iz.ru, што прыведзеная сітуацыя пацвярджае: ЕС даўно выкарыстоўвае інструмент квот і допускаў, як і санкцый, у якасці палітычнага, а не эканамічнага. «У дадзеным выпадку гэта быў палітычны жэст у адносінах да Украіны. Прычым нават нельга адназначна сказаць, што пры вывазе збожжа ўкраінскі бюджэт атрымае сур'ёзнае папаўненне, бо больш за ўсё зарабляюць на гэтай здзелцы транснацыянальныя карпарацыі. ЕС згуляў, у першую чаргу, менавіта на карысць гэтым карпарацыям. А размовы аб неабходнасці дапамагчы ўкраінцам зарабіць — крывадушная палітычная рыторыка, якая нічога не вартая», — падкрэсліла прафесар. Эксперт канстатавала, што ў ЕС «лабіруюцца інтарэсы транснацыянальных карпарацый, якім праз інструменты еўрабюракратыі лягчэй рашаць свае эканамічныя задачы. Інтарэсы польскіх фермераў тут увогуле не ўлічваюцца».

Тым часам стала вядома, што паліцыя спыніла акцыю пратэсту польскіх фермераў супраць масавых паставак украінскага збожжа ў Польшчу. Сілавікі жорстка «прынялі» іх. Аб гэтым напісаў у сацсетцы лідар польскіх фермераў Міхал Каладзейчак. «Напарадзе яшчэ больш банкруцтваў і сямейных драм», — заявіў ён, маючы на ўвазе, што сельскагаспадарчы прыватны бізнес у Польшчы пераважна носіць сямейны характар.

На думку аглядальніка польскага выдання Dziennik Polityczny Марэка Галаша, афіцыйная Варшава разбурае польскую эканоміку знутры, што толькі ўзмацняе негатыўны імідж краіны на міжнародным арэне. «Эканамічныя няўдачы краіны не пакідаюць сумненняў у тым, што наш урад абсалютна не зацікаўлены ў дабрабыце свайго народа, — лічыць эксперт. — Імперскія амбіцыі, якія прасоўваюцца ЗША, не бяруць да ўвагі людзей. Асноўны пасыл у тым, што іх не трэба любіць, галоўнае, каб яны паважалі і слухаліся. Звычайна такое стаўленне да свайго народа і суседніх краін ні да чога добрага ў гісторыі не прыводзіла». Эксперт мяркуе, што «непрымірымыя ўнутраныя супярэчнасці могуць прывесці да аслаблення любой улады ў краіне і магчымасці навязвання звонку больш жорсткага кіравання». «І там неўзабаве да чацвёртага падзелу Рэчы Паспалітай дойдзе», — падсумаваў аглядальнік Dziennik Polityczny.

Пётр ДУНЬКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Продавец	ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61

Предмет аукциона – Оборудование (бывшее в употреблении), реализуемое одним лотом, по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Наконечникова, 50:

1. Машина формовочная DISAMATIC 2110 МК3 (ID № 97.2704) в составе: формовочная машина; стержнеукладчик; электронная панель оператора PLC; два конвейера; лестницы и площадка обслуживания.

2. Бункер (формовочной смеси) с отводным конвейером и воронкой

Начальная цена	**312 816,00 бел.руб. с учетом НДС 20 %**

Задаток в размере 26 068,00 бел. руб. перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок заключения договора купли-продажи: 20 рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в размере 100 % в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.
Если победителем признается участник – нерезидент РБ, то оплата за предмет аукциона может осуществляться в валюте (доллар, евро, российский рубль) по официальному курсу НБРБ на дату проведения платежа

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.12.2022 г.

Дата и время проведения аукциона	**13.03.2023** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время окончания приема документов	**10.03.2023** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by
Продавец	Частное предприятие «Азорика», г. Слоним, ул. Барановичская, 41/1

Предмет электронных торгов

АДМИНИСТРАТИВНОЕ ЗДАНИЕ (здание административно-хозяйственное), инвентарный № 450/С-18919, общ. пл. 462 кв. м, по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 287.

Составные части и принадлежности: Подвал, благоустройство, ограждение, покрытие, два покрытия бетонных, покрытие из бетонных плит, бордюр дорожный, покрытие асфальтобетонное, бордюр тротуарный, участок канализационной сети, участок водопроводной сети.
Земельный участок: общ. пл. 0,1139 га предоставлен продавцу для обслуживания административного здания на праве аренды до 04.11.2039 г.

Начальная цена без НДС – 135 000 бел. руб.
Шаг аукциона – 5 % от текущей цены

Задаток 1 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 13.03.2023 г.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **10.03.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by.

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: info@ipmtorgi.by**

Могилевский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Компания «МогНат»

Аукцион состоится 10.03.2023 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Лот № 1:

Капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – Котельная, пл. – 687,6 кв. м.
Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – Мазутонасосная, пл. – 41,0 кв. м.
Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – Склад, пл. – 44,2 кв. м.
Емкость металлическая 80 м³, инв. № 5283.

Лот № 1 расположен по адресу:
г. Могилев, ул. Островского, 64, 64В, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га). Отдельный земельный участок под обслуживание лота № 1 не выделен.

Начальная цена продажи: 105 360,00 бел. рублей с учетом НДС. Сумма задатка: 10 536,00 бел. руб

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок подачи документов для участия в аукционе: **по 09.03.2023 до 11.00.**

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о созыве и проведении повторного внеочередного общего собрания акционеров

ОАО «Минскводстрой»

(220090, Республика Беларусь, г. Минск, Советский район, ул. Широкая, 4)

Уважаемые акционеры, сообщаем Вам, что в связи с отсутствием кворума на созываемом 03.02.2023 внеочередном общем собрании акционеров ОАО «Минскводстрой» повторное внеочередное Общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Минскводстрой» (далее – Общество) будет проводиться в очной форме 21 февраля 2023 в 10.00 по адресу: Республика Беларусь, Минск, ул. Шафарнянская, 11, 4-й этаж , пом. 400, конференц-зал.

Вопрос повестки дня собрания:

1. О продлении срока ликвидации ОАО «Минскводстрой».

Внеочередное общее собрание акционеров созвано по решению и собственной инициативе Наблюдательного совета Общества согласно ст. 32 Устава Общества. По решению Наблюдательного совета Общества ход общего собрания акционеров будет фиксироваться посредством аудио и/или видеозаписи.

Ознакомиться с решением о созыве и проведении повторного внеочередного общего собрания акционеров Общества, иными документами (информацией), подлежащими предоставлению при подготовке к проведению собрания, можно после согласования даты и времени ознакомления по телефону +375 29 665 06 65 либо 21 февраля 2023 г. с 09.00 до 09.50 по месту проведения повторного внеочередного общего собрания акционеров.

Регистрация участников повторного внеочередного общего собрания акционеров будет проводиться 21 февраля 2023 г. с 09.30 до 10.00 по месту проведения общего собрания акционеров на основании документа, удостоверяющего личность (паспорт), для представителя юридического лица – также документа, подтверждающего полномочия (доверенность или договор).

УНП600013209

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»
(организатор аукциона)
информирует об ошибочно указанной начальной цене, задатке лотов.

Новая начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб., с понижением начальной стоимости на 30 % составляет: лот № 6 – 712 861,67 бел. руб. (задаток – 71 286,17 бел. руб.), лот № 7 – 290 522,01 бел.руб. (задаток – 29 052,20 бел. руб.), в аукционе назначенного на **15.02.2023 г.** имущества **ОАО «Белфа»** (продавец), согласно извещению от 27.01.2023 г. в газете «Звязда». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 09.11.2022 г. № 220 (29842).

Дата, место, время проведения аукциона, согласно публикации от 27.01.2023 в газете «Звязда» № 17 (29897).

УНП 400071204

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «СК-ЕвроИнвест»

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении первых электронных торгов **№ 2023.Ч.002.00021** и повторных электронных торгов **№ 2023.Ч.002.00018** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

Продавец: Общество с ограниченной ответственностью «СК-ЕвроИнвест» 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by**.

Дата и время проведения электронных торгов № 2023.Ч.002.00021 13 марта 2023 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Кап. строение с инв. № 200/С-76608 площадью 1469,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-д Октябрьский, 8, наименование – здание нежилое, назначение – здание нежилое, составные части и принадлежности: подвал, линия электропередачи, линия электропередачи, площадка, дорожка, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000002006354 площадью 0,2279 га (право аренды) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-д Октябрьский, 8, целевое назначение зем. участка – для строительства объекта «Реконструкция нежилого здания, расположенного по Октябрьскому проезду, 8 в г. Витебске под многоквартирный жилой дом». Кап.строение с инв. № 200/С-88137 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Октябрьский проезд, сети канализации от здания № 8, протяженность 63,3 м, наименование: сети канализации, назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: два участка сети.

Нач. цена: 810 000,00 бел. руб. с учетом НДС.

Задаток: 81 000,00 бел. руб.

Дата и время проведения повторных электронных торгов торгов № 2023.Ч.002.00018 13 марта 2023 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Кап. строение с инв. № 200/С-1795 площадью 853,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 28, наименование – здание нежилое, назначение – здание нежилое, составные части и принадлежности: пешеходная часть, калитка, ворота. Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия.

Кап. строение с инв. № 200/С-77793 площадью 56 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, д. 26, наименование – одноэтажный кирпичный жилой дом, назначение – здание одноквартирного жилого дома, составные части и принадлежности: с пристройкой и сенями. Вышеуказанные кап. строения находятся на земельном участке с кадастровым № 240100000002006875 площадью 0,1198 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 28 (право аренды) и земельном участке с кадастровым № 240100000002006676 площадью 0,0421 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 26 (право аренды) и земельном участке с кадастровым № 240100000002006676 площадью 0,0421 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 26 (право аренды). Целевое назначение зем. участков – для строительства объекта «Реконструкция нежилого здания № 28 по ул. Комсомольской (памятник архитектуры – застройка по ул. Комсомольской 13/6, 28, 30, 32/16 конца XIX – начала XX века) и нежилого здания № 26 по ул. Комсомольской в г. Витебске под размещение гостиницы «Бристоль».

Нач. цена: 1 102 000,00 бел. руб. с учетом НДС.

Задаток 110 200,00 бел. руб.

Первые и повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by.

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах, согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по первым и повторным электронным торгам: **до 16.00 10.03.2023**.

Задаток по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Код операции – 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия первых электронных торгов № 2023.Ч.002.00021 и повторных электронных торгов № 2023.Ч.002.00018: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней после утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП, согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; в течение 11 раб. дней со дня утверждения протокола эл. торгов подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи.

Доп. условие повторных эл. торгов № 2023.Ч.002.00018: подписать охранное обязательство в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности на объект недвижимости. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе «Недвижимое имущество». Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения торгов, отказаться от проведения торгов. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Телешова Татьяна Викторовна +375 29 5178157.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) в процедуре ликвидации юридического лица проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

• склад тяжелых металлов с инв. № 640/С-39784 общей площадью 634,6 кв. м, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101Д;

• очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331) с инв. № 640/С-84365, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101;

• дренажная насосная станция (инв. № 98329) с инв. № 640/С-84375 общей площадью 330,6 кв. м, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101/7.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624650100001010099 *(право аренды по 18.01.2053)* **площадью 0,2816 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101Д.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: территория, подлежащая специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), пл. 0,2816 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 115 000,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **11 500,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов, (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Аукцион состоится **15.03.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2023** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (044) 72 35 122.

УНП 600074992

КВАТЭРА З ПРАБЛЕМАМІ,
АБО НА ШТО ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ ПРЫ КУПЛІ ЖЫЛЛЯ

Калі «ўсплываюць» загадкавыя дзеці былога мужа

Быў адзін такі выпадак, калі пасля куплі жылля праз нейкі час з'яўляюцца спадчыннікі былога ўладальніка кватэры і прад'яўляюць правы на яе. У гэтым выпадку разбірацца з кватэрамі прыйдзецца ўжо ў судзе. А сітуацыя была такая.

Пэўны час назад маладыя людзі развяліся і ніяк натарыяльна не вызначылі лёс сваёй нерухомасці. Былы муж з'язджае за мяжу, дзе праз некалькі гадоў памірае. Прайшоў час, жонка тут, у Беларусі, сабралася прадаць кватэру. І адразу ўзнікае пытанне: а ці не ажаніўся яе былы муж ізноў, ці няма ў яго дзяцей, законных спадчыннікаў, якія могуць аб'явіцца ў самы нечаканы момант?

Таму, калі кватэру прадаюць маладыя мужчына ці жанчына, якія цяпер не жанатыя, не замужам, рыэлтары (або будучыя ўласнікі жылля) едуць у архіў загса і правяраюць, ці не былі прадаўцы ў шлюбе на момант набыцця жылля. У гэтым выпадку верыць на слова — сабе даражэй.

Калі нешта з галавой

Спецыялісты па нерухомасці папярэджваюць: асабліва ўважлівым трэба быць, калі прадае кватэру чалавек, які знаходзіцца на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансеры.

Напрыклад, быў выпадак, калі жанчына прадавала кватэру, і па асабовым рахунку эксперты ўбачылі, што на кватэру быў аформлены дагавор дарэння двухгадовай даўнасці. Аформіла дароўную сястра гэтай жанчыны. Дык вось сястра, якая афармляла дароўную грамату, на той момант знаходзілася ў псіхдыспансеры. У дзень афармлення яе з дыспансера вызвалілі, узялі даведку, што яна на той момант нібыта здаровая, а потым яе ў дыспансер ізноў вярнулі — прызналі хворай. Спецыялісты ў той сітуацыі параілі пакупніку адмовіцца ад гэтай здзелкі. Бо не выключана, што сястра, якая аформіла дароўную, можа вярнуцца з медустановы і запатрабаваць кватэру.

У свой час некаторыя людзі заблыталі шляхам ашуканскіх схем, выкарыстоўваючы статус па псіхічным здароўі. У нас у заканадаўстве ёсць такая фармулёўка, як «не аддаваў справаздачу ў сваіх дзеяннях». Вось адзін з такіх выпадкаў.

Пажылая жанчына прадавала кватэру без дапамогі агенцтва, а праз тры месяцы пасля гэтага з'явілася ў суд, дзе пачала плакаць і распавядаць, што некалькі месяцаў таму адчувала сябе вельмі дрэнна, і ўрач ёй прапісаў прэпараты. Вынік — яна не памятае, як прадала кватэру, як і факт перадачы грошай. І суд прызнаў гэтую здзелку нікчэмнай, гэта значыць, усё вырашылася не на карысць добрасумленнага пакупніка, а кватэру зноў перадалі гэтай жанчыне. Але не прайшло і паўгода, як яна зноў з'явілася ў суд. І толькі пасля гэтага ёю зацікавіліся праваахоўныя органы.

Даўгі

Практыка паказвае, што не ўсе ўласнікі з запазычанасцямі па аплаце камунальных паслуг гатовыя ў гэтым прызнацца. Асабліва адчайныя ўласнікі нерухомасці спадзяюцца на тое, што пакупнік не

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Перапланіроўка, па законе…

стане правяраць аплату камуналкі і доўг пяройдзе яму пасля пакупкі. Зразумела, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе не аб пратэрміноўцы ў адзін месяц, а аб буйной суме доўгу. Якія паслугі павінны быць аплачаны прадаўцом да здзелкі?

Асноўныя камунальныя плацяжы прыходзяць штомесяц у «жыроўцы» ад разлікова-даведачнага цэнтра (РДЦ) або таварыства ўласнікаў. Іх трэба аплачваць у тэрмін, не пазней за 25 чысло бягучага месяца за мінулы месяц. Далей ідуць электраэнергія, газ, тэлефон і інтэрнэт. Што тычыцца інтэрнэту, то пры перадачы кватэры новаму ўласніку трэба дамовіцца аб тым, што будзе адбывацца з абсталяваннем, якое выдаецца правайдарам. Напрыклад, мадэм. Абсталяванне можна перааформіць на новага ўласніка, калі ён плануе пакінуць абслугоўванне таго ж правайдара. Пры скасаванні дагавора на абслугоўванне ўласнік абавязаны здаць абсталяванне свайму правайдару.

Як засцерагчыся перад купляй кватэры? Даўгі па камунальных плацяжах лёгка праверыць. Перад здзелкай або ў момант перадачы аб'екта ад прадаўца да пакупніка прадавец павінен мець пры сабе квітанцыі аб аплаце ўсіх паслуг. Або выпіску з электроннага дакумента аб аплаце дадзеных плацяжоў па «жыроўцы», калі паслугі аплачваюцца праз АРІП.

Калі вы не давяраеце прадаўцу, то з ім можна сесці і праверыць усе аплаты па нумары асабовага рахунку. Абавязкова ўдакладніце, ці ўстаноўлены прыборы ўліку электраэнергіі, вада- і газазабеспячэння. Зверце фактычныя і аплачаныя паказчыкі. Бываюць выпадкі, калі нядобрасумленныя грамадзяне перадаюць у абслуговую арганізацыю заніжаныя паказчыкі прыбораў.

Калі ёсць падазрэнні, што прыбор няспраўны, бо выдае занадта высокія ці занадта нізкія паказчыкі, то звярніцеся ў прафільную арганізацыю. Ва ўласніка павінен

ўладальніка нерухомасці? Аказваецца, што вас не могуць абавязаць аплачваць доўг былога ўласніка. Адказнасць за запазычанасць па аплаце камунальных паслуг ляжыць не на самім аб'екце, а на ўласніку, які там жыве або жыў. Доўг не пераходзіць новаму ўласніку ў выпадку продажу аб'екта, а застаецца за былым уладальнікам.

Але гэта ў тэорыі, а на практыцы РДЦ або сельсавет цалкам могуць патрабаваць ад вас аплаты доўгу, ды яшчэ і выстаўляць пеню. Калі вы ўсё ж купілі аб'ект з запазычанасцю, то першае, што трэба зрабіць, — паведаміць абслуговай арганізацыі аб змене ўласніка. Таксама неабходна перааформіць асабовыя рахункі на сваё імя і заключыць новыя дагаворы на

…і не вельмі.

быць заключаны дагавор на абслугоўванне з водаканалам, энергазбытам і Мінгазам. Спецыяліст не толькі праверыць паказанні прыбора, але і вызначыць няспраўнасць (спраўнасць) прыбора ўліку або абсталявання. Напрыклад, газавай пліты або калонкі.

Калі сума доўгу вялікая і выканаўчы працэс пачаўся, то такую кватэру нельга будзе купіць да поўнага пагашэння доўгу. У дадзеным выпадку ёсць два варыянты. У першым уласнік аплачвае доўг і здымае забарону на продаж. Пасля гэтага пачынаецца падрыхтоўка да продажу жылля.

Па другім варыянце сума, за якую ўласнік прадае нерухомасць, можа быць зменшана на суму доўгу. У такім выпадку без дапамогі прафесійных рыэлтараў, якія змогуць правільна аформіць дакументы, абысціся будзе складана. Доўг аплачваецца, забарона здымаецца, і пачынаецца падрыхтоўка да продажу.

Цікава, а ці абавязаны новы ўласнік аплачваць даўгі папярэдняга абслугоўванне. У якасці пацвярджэння можна прыкласці копію дагавора куплі-продажу і пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу права ўласнасці. Рэкамендуецца зафіксаваць паказанні ўсіх лічыльнікаў на момант куплі кватэры.

Замест балкона — дадатковы пакой

Пры куплі кватэры з асцярожнасцю неабходна ставіцца да той, у якой зроблена неўзаконеная перапланіроўка, папярэджваюць спецыялісты.

Нагадаем, што, згодна з заканадаўствам, кватэра павінна прадавацца ў адпаведнасці з тэхнічнымі характарыстыкамі, названымі ў тэхпашпарце. Складанасці ўзнікаюць тады, калі людзі робяць такую перапланіроўку, якую нельга ўзаконіць.

Так, напрыклад, у старых панэльных дамах многія калісьці высякалі ў вентыляцыйнай шахце на кухні нішу пад халадзільнік. Злучэнне балкона або лоджыі з жылым ацяпляльным памяшканнем (сустракаецца вельмі часта) — гэта таксама неўзаконеная перапланіроўка. Гэтага рабіць катэгарычна нельга і ўзаконіць немагчыма, кажуць эксперты другаснага рынку нерухомасці. А тое, што нельга ўзаконіць, паводле заканадаўства, трэба прывесці ў першапачатковы стан. Пакупніку, які бачыць такія парушэнні, варта адмовіцца ад набыцця кватэры.

Прапісаны там дзядзька з Аўстраліі

Купля кватэры з прапісанымі людзьмі — яшчэ адзін непрыемны сюрпрыз, які можа чакаць пакупніка. Сітуацыя можа выглядаць так: у кватэры жылі вылікай сям'ёй, потым дзеці выраслі, адзін з двух (трох) дзяцей з'ехаў за мяжу і не выпісаўся. Уявім, што ён ужо даўно жыве за мяжой, уладкаваўся там, рэдка прыязджае. Праходзіць час, бацькі, якія пражывалі ў гэтай кватэры, памерлі. Уступіла ў правы спадчыны другое дзіця, якое жыве тут, у Беларусі. Потым гэты чалавек вырашае прадаць кватэру. І ўзнікае праблема. Асабовы рахунак паказвае, што ў кватэры прапісаны яшчэ адзін чалавек, які ўжо даўно жыве, скажам, у Аўстраліі. А бывае, што людзі не размаўляюць, роднасныя сувязі не падтрымліваюць. Як вырашаецца гэтая праблема?

Па заканадаўстве, пры продажы кватэры павінна быць ад кожнага прапісанага згода на продаж. Калі прапісаны не сваяк, то яго можна выпісаць па судзе. Са сваякамі складаней.

Калі члены сям'і камунікуюць, чалавек, які знаходзіцца за мяжой, можа прадаць даверанасць, у якой будзе напісана, што ён просіць зарэгістраваць яго па іншым месцы жыхарства. І асоба, на якую ён аформіў даверанасць, можа яго перарэгістраваць па новым месцы жыхарства. Гэта адзін з самых простых спосабаў.

Шэраг складанасцяў з'яўляецца, калі члены сям'і не падтрымліваюць стасункі. У гэтым выпадку прыйдзецца даказваць, што сваяк не з'яўляецца ў краіне ўжо шмат гадоў. Зразумела, гэта зойме нямала часу, але такім чынам можна выпісаць чалавека па судзе.

Выбыў у месцы пазбаўлення волі

Неабходна таксама праверыць, ці няма выпісаных з кватэры, якія цяпер асуджаны. Па законе, вярнуўшыся, такі чалавек мае права прапісацца і жыць у гэтай кватэры. Значыць, жыллё было прададзена без яго ўдзелу, калі ён быў асуджаны.

Такія сітуацыі таксама сустракаюцца, чалавек прыязджае і кажа, што ён будзе тут жыць. У падобных выпадках лепш купляць кватэру з дапамогай агенцтва. Там абавязкова ўдакладняць, як кватэра набывалася, на якой падставе гэты чалавек быў прапісаны, ступень яго сваяцтва з людзьмі, якія збіраюцца прадаць кватэру.

Сяргей КУРКАЧ.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Вырошчванне расады ў рулонах

Кожны агароднік марыць вырасціць пабольш расады самастойна. А колькасць будучых саджанцаў непасрэдна залежыць ад плошчы, якую можна выдзеліць пад скрыні і стаканчыкі. Таму ўсё большай папулярнасцю карыстаецца метад сяўбы насення ў рулоны. Яны ўяўляюць з сябе невялікія скруткі туалетнай паперы, газеты ці ўспененага вінілу, у якіх вырошчваюць расаду да пікіроўкі або высадкі ў грунт. Вырошчванне расады ў рулонах паказвае добрыя вынікі і падыходзіць для насення, якому для таго, каб праклюнуцца, не патрабуецца святло. Дадзены метад можна выкарыстоўваць практычна для ўсіх агародных, кветкавых і ягадных культур.

ЯК ПАСАДЗІЦЬ

Туалетная папера

Зрабіць рулон з туалетнай паперы проста. Для гэтага спатрэбяцца: поліэтыленавая плёнка; шматслойная ці аднаслойная, складзеная ў некалькі пластоў туалетная папера; пластыкавыя стаканчыкі; распыляльнік з вадой; насенне.

З плёнкі нарэзаць палоскі шырынёй 10-12 см. На іх пакласці пласт паперы і злёгку апырскаць вадой з пульверызатара. Раскласці насенне на першым, увільготненым пласце, адыходзячы ад краю 1-2 см, у залежнасці ад памеру насення. Адлегласць паміж ім трэба рабіць раўнамернай — 3-5 см. Насенне накрыць яшчэ адным пластом паперы і добра намачыць вадой. Атрыманую палоску трэба акуратна згарнуць у рулончык, не дапускаючы ссоўвання плёнкі. Зафіксаваць скрутак канцылярскай гумкай, не перацягваючы, і паставіць у шклянку з вадой. Вады павінна быць няшмат — 2-3 см.

Накрыць стаканчык з расадай поліэтыленам і паставіць у цёмнае цёплае месца. Пры з'яўленні парасткаў зняць пакет і перамясціць ёмкасць на светлае месца.

Газета

Для вырабу рулона з газетнай паперы спатрэбяцца: газетны ліст (разварот); цэлафанавы пакет; падрыхтаваны грунт; насенне.

Газету трэба згарнуць уздоўж, каб атрымаліся чатыры папяровыя пласты. Укласці атрыманую газетную палоску ў пакет, змясціўшы з аднаго боку. Вольны бок пакета будзе служыць дном скрутка. На поліэтылен з газетай насыпаць пласт увільготненай зямлі. Раскласці насенне і скруціць рулон, пачынаючы згортванне з тога боку, дзе запаяны пакет. Атрыманы рулон зафіксаваць гумкай, ніткай або скотчам. Пры неабходнасці дасыпаць грунту. Рулон паставіць у ёмкасць, паліць, накрыць пакетам і пакінуць да з'яўлення першых парасткаў.

Успенены вініл

Для скрутка падыдзе выключна тонкі (таўшчынёй не больш за 2 мм) успенены вініл, напрыклад, падкладка для ламінату. Яго неабходна нарэзаць на палоскі шырынёй 20 см. Даўжыня адрэзка залежыць ад колькасці саджанцаў. Семкі размясціць на грунце, насыпаным на вінілавую стужку, на аднолькавай адлегласці адно ад аднаго. Загарнуць вініл з грунтам і насеннем у рулон і замацаваць. Змясціць скрутак на паддон, паліць, абгарнуць плёнкай і чакаць усходаў.

ПРАВІЛЬНЫ ДОГЛЯД

Адразу ж пасля з'яўлення першых усходаў неабходна зняць пакет і перамясціць ёмкасці з рулонамі ў добра асветленае месца.

Асноўны догляд за расадай у рулонах з зямлёй заключаецца ў паліве. Скруткі ўвільгатняюць зверху з дапамогай распыляльніка, каб не дапусціць вымывання насення і маладзенькіх раслін. Пакуль парасткі яшчэ не адужэлі і іх каранёвая сістэма недастаткова развітая, увільгатненне абавязкова праводзяць зверху. Далей пераходзяць на прыкаранёвы паліў.

Догляд расады ў рулонах з туалетнай паперы складаецца ў падтрыманні ўзроўню вады ў ёмкасці. Для таго каб не дапусціць выцягвання расады, ёмістасці са скруткамі некалькі разоў на працягу дня паварочваюць у бок крыніцы святла.

Пікіроўку раслін, вырашчаных у рулонах без зямлі, праводзяць, калі ў саджанцаў з'явіцца першы сапраўдны лісток, а карэньчыкі праглянуць знізу скрутка. Тады яго акуратна раскручваюць, аддзяляюць парастак (можна разам з паперай) і змяшчаюць у асобную ёмкасць з грунтам.

Пры сяўбе насення ў рулоны з зямлёй загадзя плануецца, ці будзе праводзіцца пікіроўка. Калі ж пікіроўка не планавалася, распачынаюць высадку саджанцаў на пастаяннае месца толькі калі ўсталюецца спрыяльнае надвор'е. Для гэтага скруткі асцярожна, каб не пашкодзіць карані, разгортваюць, бяруць расліны з камяком зямлі і змяшчаюць у падрыхтаваную лунку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.42	18.06	9.24
Віцебск —	8.36	17.52	9.16
Магілёў —	8.32	17.56	9.24
Гомель —	8.24	17.57	9.33
Гродна —	8.57	18.22	9.25
Брэст —	8.53	18.27	9.34

Месяц

Поўня 5 лютага.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Івана.*
К. *Апалоніі, Бярнарды, Сабіны, Бярнарда, Кірыла, Раймунда, Эрыка.*

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Алё, гэта рэгістратура?

— Так.

— Хірург Ломаў сёння прымае?..

— Як звычайна.

— Я не ў сэнсе «як звычайна», а ў сэнсе хворых!

— Дарагі, а падары мне айфон...

— Дарагая, магу! Але з адной умовай.

— Я згодна на ўсё!

— Крэдыт аформлю на цябе.

Даты Падзеі Людзі

9 ЛЮТАГА

У краіне

1547 год — нарадзіўся Крыштаф Радзівіл (па мянушцы Пярун), ваенны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Удзельнік Лівонскай вайны (1558—1583). З 1584 года — ваявода віленскі. Пасля смерці Стэфана Баторыя падтрымліваў план часткі магнатаў і шляхты ВКЛ стварыць дзяржаўную унію Польшчы, ВКЛ і Расіі на чале з вялікім князем.



1886 год — нарадзіўся Аляксандр Фёдаравіч Мяснікоў, партыйны і дзяржаўны дзеяч, удзельнічаў у станаўленні савецкай улады ў Беларусі. Адзін з першых рэдактараў газеты «Звязда». У 1919 годзе — член Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі, старшыня ЦВК ССРБ, намеснік старшыні СНК ССРБ і наркам па ваенных справах. Аўтар работ па тэорыі рэвалюцыйнага руху, вайсковай літаратуры. Загінуў у авіяцыйнай катастрофе. Імем Мяснікова названы вуліца, плошча ў Мінску, а таксама ў многіх іншых гарадах краіны.

1930 год — нарадзіўся (г. Мінск) Валянцін Яфімавіч Тарас, беларускі пісьменнік. Працаваў у газеце «Звязда», часопісе «Нёман». Пісаў на рускай і беларускай мовах. Аўтар зборнікаў паэзіі «Минска улицы родные», «Доверие», «Тревожная земля» і іншых шматлікіх кніг аповесцяў і апавяданняў. Аўтар мемуараў «На выспе ўспамінаў». На кінастудыі «Беларусьфільм» па яго сцэнарыях зняты шэраг дакументальных стужак: «Праз усю вайну» (на падставе аднайменнай праграмы «Песняроў»), «Зорка Максіма» (кінаэсэ пра М. Багдановіча), «Наш Пімен» (да 70-годдзя П. Панчанкі), «Вяртанне ў першы снег» (пра Р. Барадуліна), некалькі мультыплікацыйных фільмаў.

1931 год — у Мінску ў рамках мерапрыемстваў па аб'яўленай вайне з п'янствам у будынку нясупраць кінатэатра «Чырвоная зорка» пачала працаваць першая ў горадзе ўзорная чайная з бібліятэкай, чытальнай залай і радыёкропкамі з навушнікамі на кожным стале.

У свеце

1783 год — нарадзіўся Васіль Андрэевіч Жукоўскі, рускі паэт і перакладчык, адзін з заснавальнікаў рускага рамантызму, акадэмік Пецярбургскай АН. Быў настаўнікам спадчынніка рускага прастола, у далейшым — імператара Аляксандра II, на працягу чвэрці стагоддзя ўваходзіў у блізкае асяроддзе імператарскага двара. Аўтар балад «Людміла», «Святлана». Пераклаў «Адысею» Гамера, творы Ф. Шылера, Дж. Байрана. Яму належаць словы гімна Расійскай імперыі «Боже, Царя храни».

1887 год — нарадзіўся Васіль Іванавіч Чапаеў, легендарны камдыў часоў Грамадзянскай вайны. З 1918 года камандаваў атрадам, брыгадай і 25-й стралковай дывізіяй, якая выканала значную ролю ў разгроме войскаў Калчака летам 1919 г. Загінуў у баі. Вобраз Чапаева — у рамане Д. Фурманава «Чапаеў» і аднайменным кінафільме. У Беларусі яго імем названы вуліцы ў многіх гарадах. У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі краіны яго імя насілі сем партызанскіх брыгад і дзясяткі атрадаў.

1943 год — у Грымучым лесе паблізу г. Ровенькі гітлераўцамі былі расстраляныя кіраўнікі падпольнай антыфашысцкай камсамольскай арганізацыі «Маладая гвардыя» А. Кашавой, Л. Шаўцова і іншыя члены арганізацыі.

Так гаварыў...

ФРЭНСІС БЭКАН:

«Асцярожнасць у словах вышэй за красамоўства».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звязде», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.681. Індэкс 63850. Зак. № 414.

Нумар падпісаны ў 19.30

8 лютага 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12